Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 38 (494) | Субота, 23 лістапада 1940 года | Цана 20 кап.

Адам Міцкевіч

Восемдзесят пяць год назад, 26 лістапада 1855 года ў Канстантынопалі памёр адзін з найвялікшых прадстаўнікоў сусветнай літаратуры, вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч.

Совецкі народ глыбока шануе памяць чалавека і мастака Міцкевіча, чый жыццёвы лёс яўляе сабой ўзор чалавечага благародства, няўхільнага імкнення да праўды, натхнёнай і непакойнай творчасці.

«Агульнае ўражанне яго фігуры, —пісаў Герцэн,—галавы з пышнымі сівымі валасамі і стомленым поглядам выражала перажытае няшчасце, знаёмства з унутраным болем, экзальтацыю смутку; гэта быў пластычны вобраз лёсу Польшчы». Такім быў Міцкевіч 40—50-х год XIX стагоддзя, калі за плячыма паэта было доўгае і цяжкое жыццё.

Асноўнай ідэяй творчасці Міцкевіча, яго пафасам былі нястомныя шуканні шляхоў вызвалення сваёй бацькаўшчыны. У сваіх ранніх вершах Міцкевіч, удзельнік гуртвоў філаматаў, якія ставілі сабе мэтай аднаўленне самастойнай Польшчы, выражае ўпэўненасць у ажыццяўленні справы адраджэння радзімы. Але рамантычныя мары паэта сутыкаюцца з логікай жыцця. Міцкевіч зразумеў беспадстаўнасць сваіх спадзяванняў на польскі нацыянальны вызваленчы рух, у якім былі вельмі моцны элементы шляхецкага нацыяналізма. Міцкевіч едзе ў Расію, у якой наспявалі вялікія падзеі, у Расію, чый сацыяльны, бытавы і дзяржаўны ўклад ужо раз'ядаў філасофскі скепсіс Чаадаева, у Расію, дзе жыў і дзейнічаў дапытлівы розум Пушкіна, дзе дваранскія рэвалюцыянеры, хаваючыся, рыхтавалі цару снежаньскае паўстанне. Прабыванне ў Расіі спрыяла вызваленню Міцкевіча ад нацыяналістычных ілюзій.

Калі Міцкевіч прыехаў у Расію, у яго, апрача юнацкіх вершаў, былі ўжо напісаны—«Балады і рамансы», у якіх паэт робіць спробу наблізіцца к народу, к крыніцам народнай паэзіі. Творчае сазнанне Міцкевіча—паэта заўсёды было дэмакратычным і таму часта ўступала ў супярэчанні з яго палітычным светапоглядам, у якім былі моцныя праяўленні месіянскіх і каталіцкіх ідэй. Гэта супярэчнасць, сама па сабе, не была асаблівасцю і адзнакай індывідуальнага сазнання Міцкевіча,—яна адлюстроўвала надзвычай тыповую сітуацыю, характэрную для польскага жыцця. Вось чаму гэта супярэчнасць нарадзіла бессмяротныя паэтычныя вобразы, пазнавальнае значэнне якіх не гасне ў вяках.

«Мільтон і Дантэ, Міцкевіч, Гётэ і Шылер,—пісаў Максім Горкі ў артыкуле «Разбурэнне асобы»,—узносіліся вышэй за ўсё тады, калі іх акрыляла творчасць калектыва, калі яны чэрпалі натхненне з крыніц народнай паэзіі, бязмерна глыбокай, незлічона разнастайнай, моцнай і мудрай».

Радасна ўсведамляць, што ў скарбніцы паэтычных дум Міцкевіча адно з самых пачэсных месц займаюць песні беларускага народа, якімі яшчэ ў маленстве заслухоўваўся вялікі паэт.

У Расіі Міцкевіч сустрэўся і здружыўся з вялікім Пушкіным. Гэта была незвычайная і хвалюючая дружба двух паэтаў, якія гатовы былі аддаць жыццё за свабоду народаў. У вершы «Помнік Пятра Вялікага» Міцкевіч, успамінаючы свае сустрэчы з Пушкіным, напісаў кранальна-пяшчотныя радкі: «Увечары, у непагадзь стаялі два юнакі пад адным плашчом, узяўшыся за рукі. Адзін быў выгнаннік, прышэлец з Захаду, невядомая ахвяра царскага гнёту, другі—паэт рускага народа...» Так і застаюцца яны ў вяках: узяўшыся за рукі, прыкрытыя адным плашчом,—два вялікія паэты чалавецтва!

Міцкевіч пакінуў значны след у паэтычнай творчасці Пушкіна. У пушкінскім вершы «Санет» імя Міцкевіча стаіць побач з імёнамі Дантэ, Петраркі, Камоэнса, Шэкспіра. Пушкін пераклаў «Будрыса», «Ваяводу» і ўступ да «Канрада Валенрода».


У Расіі Міцкевіч напісаў сваю паэму «Канрад Валенрод», якая дала выключна глыбокае выражэнне таго разрыву, які ўтварыўся паміж дваранскім грамадствам і народам, паміж польскім нацыянальна-вызваленчым рухам і народнымі імкненнямі. Міцкевіч асуджае ўсякую дзяржаўнасць, якая чужва народу. Паэтычная эпапея Міцкевіча «Пан Тадэуш» з'яўляецца геніяльным помнікам польскай шляхце, якая загінула з прычыны сваёй антыдэмакратычнай прыроды.

Сёння, на руінах былой антынароднай Польскай дзяржавы, якая прыгнятала народ, заціскала правы нацыянальнасцей, вырастае гіганцкая фігура Міцкевіча, паэта і прарока. Народ працягвае паэту для поціску сваю велізарную далонь.

Разбурэнне панскай Польшчы, гістарычны праобраз якой неаднаразова асуджаўся Міцкевічам, зрабіла магчымым набліжэнне паэта к свайму народу. Ёсць нешта хвалюючае ў тым, што чырвонаармейскія часці, якія ўступілі ў Навагрудак—радзіму паэта, наладжвалі літаратурныя вечары, прысвечаныя памяці Міцкевіча.

Паспяховае правядзенне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, пастаянныя клопаты нашай партыі і асабіста таварыша Сталіна аб развіцці нацыянальных культур зрабілі магчымым правядзенне такога вялікага культурнага свята, якім з'яўляецца ў нашай краіне ўшанаванне 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча. У нас развіваюцца польская літаратура і мастацтва, нацыянальныя па форме і соцыялістычныя па зместу; адкрываюцца школы, газеты, тэатры, выдаюцца кнігі на польскай мове.

Совецкі народ—вялікі збіральнік культурных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам не можа абысці і паэтычную спадчыну Адама Міцкевіча.



26 лістапада 1940 года спаўняецца 85 год з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. На здымку: АДАМ МІЦКЕВІЧ. Рэпрадукцыя з вядомага партрэта польскага мастака Л. Гаровіча.

А. Міцкевіч

ВАЯВОДА

Украінская балада

З-пад прысад агарода
Бледны ўбег ваявода
У палац свой са злосцю й трывогай,
Перад спальняю стануў,
У пасцель жонкі глянуў,
Глянуў там — і не ўбачыў нікога.

Ў дол патупіўшы вочы,
Ўвесь дрыжыць, штось мармоча,
Вусы тузае, думае дзіка.
Адышоў ад пасцелі,
Жудка зрэнкамі стрэліў,
Казака тут-ж Навума паклікаў.

— «Гэй, казача, ты, хаме,
Чаму ў садзе пры браме
Ні сабакі няма, а ні стражы?!
Брашь мне торбу барсучу
І янчарку гайдучу,
Цягні стрэльбу-гвінтоўку мне ўраз-жа!»

Узялі зброю — і ходу!..
Падцякліся к гароду,
Дзе альтана хавалася ў зеллі.
На дзярновым сядзенні
Штось бялеецца ў цені:
Там сядзела кабеціна ў белі.

Вочкі ручкай адною,
Закрывала касою,
Грудзі крыла рубком кашуліны,
А другою — памалу
Ад грудзей адпіхала,
Што ў калень яе кленчыў, мужчыну.

Той, прыпаўшы к каленям,
Ёй казаў ў знемажэнні:
— «Дык усё, што было, ўжо далёка!
І тваё уздыханне,
І тваё прывітанне
Заплаціў ваявода гатоўкай!

«Хоць цябе столькі летак
Я любіў палка гэтак,
І любіць і цярпець буду здаля, —
Не любіў ён нікольні,
Бразнуў золатам толькі,
Ты яму прадалася без жалю.

«Ён штовечара будзе
Песціць белыя грудзі,
З табой цешыцца ў пуху лябяжым,
Твае — мне на загубу —
Цалаваць гючкі, губы
Будзе ён пацалункам уражым.

«Я на коніку верным
Гэтым полем бязмерным
Сюды мкнуся праз холад і слоты,
Каб вітаці ўздыханнем —
І ад'ехаць з жаданнем:
Добрай ночкі і доўгай пяшчоты!»

Яна ўсё йшчэ як глуха;
Ён ёй шэпча на вуха
Тыя жальбы, ці новы закляцці,
Аж прымлеўшы, без сілы
Ручкай грудкі адкрыла
І ў яго патанула абняцці.

З казаком ваявода
Прыкуцнулі ля ўхода
І з-за пояса бралі набоі, —
Адсякалі зубамі,
Прыбівалі штамплямі
Жменю пораху й шроту удвое.

— «Пане! — тут казак кліча,—
Нейкі чорт мною смыча,
Не магу той застрэліць дзяўчыны:
Як свой курак адводзіў,
Я ўздрыгнуў, як на лёдзе,
І спылі на падпал дзве слязіны».

— «Ціха!.. Кінь, хаме, кракаць!
Я навучу цябе плакаць!
На! тут з порахам свежым машонку;
Падсып жыва падпалу,
Ногцем зчысці красала,
Ды ў свой лоб стрэль, ці ў гэтую
жонку.

«Ўправа... вышэй... цэль дбайна!..
Жджы, пакуль я не пальну, —
Жаніха зняту перш назаўсёды».
Ўзвёў казак курак, цэліў,
Не чакаючы стрэліў,
І ўгадзіў ў самы лоб ваяводы.

Пераклаў Янка КУПАЛА.

* * *

(„ДЗЯДЫ", ЧАСТКА III)

Не дбаю, якое праклянце
Спадзе—ці Сібір, ці кайданы, —
Ў няволі, як верны падданы,
Цару буду век працаваць я.

У шахце палумаю шэрай:
«Руду няхай молат мой дробіць,
З яе нехта некалі зробіць
На царскую шыю сякеру.

Калі буду на пасяленні,
Татарку за жонку вазьму я:
Цару у маім пакаленні
Мо' Палена я узгадую.

Калі-ж стану я каланістам,
Лапатай ўскапаю загоны,
І кожнай вясной усе чыста
Засею канюплямі, лёнам.

З кудзелі срэбранай, прыгожай
Спрадуць нітку шэрую людзі,
Пахваляцца некалі, можа,
Што шарфам цару яна будзе.

Пераклаў Максім ТАНК.

БЛЫХА І РАВІН

(Байка)

Равін раз у талмудзе зарыўся па вушы,
Цярпеў, як блыха джгала; ды гнеў яго ўз'юшыў;
Прысачыў, злавіў яе. Стогне ў пальцах сцятых,
Круціцца, выцягвае пыску, нажаняты:
— «Даруй, рэбе, мудраму не варта гнявіцца;
О, святы сын Леві, не дай крыві праліцца!»
— «Кроў за кроў, — пярэчыць ён, — Вельзевула плодзе,
Тлушч, як філістымлянка, нажыўшае ў шкодзе!
Мурашкі запас маюць; рой пчол працавітых
Зносяць мёд і воск сабе, а шэршань напітак;
Ты-ж адна сярод людзей смактачом дыбаеш,
З п'яніц тым шкаднейшая, што чужога дбаеш...»
Змоўк; і як палонную павалок к расправе,
Блыха нема піскнула: «А чым жыве равін?»

Пераклаў Р. ЛЫНЬКОЎ.

Адам Міцкевіч

РЫБКА

З народнай песні.

Дзеўчына сцяжынкай роснай
Прабягае лес высокі,
Трэпле вецер яе косы,
Заліваюць слёзы шчокі.
Яна к рэчцы прыбягае,
Горкі сум сюды прыносіць,
Рукі белыя ламае,
Па-над рэчкаю галосіць:
— «Ой, вы, жыхары рачныя,
Мае сёстры-Свіцязянкі,
Слухайце, як стогне, ные
Сэрца здраджанай каханкі.
Пан мне вельмі палюбіўся,
Ўзяць за жонку прысягаўся,
Ды з княгіняй ажаніўся,
А над Крысяй насмяяўся.
Хай жыве шчаслівa, ў згодзе,
Хай пяшчотаў вын'е мора,
Толькі хай сюды не ходзіць
Насміхацца з майго гора.
Што для здраджанай каханкі
Ёсць яшчэ на свеце белым?
Дык прыміце, Свіцязянкі,
У абдымкі маё цела»...
Так прычытвае жалобна, —
Нікнуць словы жалю ў далях, —
Ў рэчку скокнула, — і дробна
Паплылі кругі па хвалях.
У той час агні мільгалі
Там, дзе панскі дом вялікі;
Госці ў пана танцавалі,
Надрываліся музыкі.
Ў гэты лямант невымерны
Далятаді плачу гукі.
І слуга пачуў іх верны,
І падняў дзіця на рукі.
І пайшоў няпэўным крокам
Ён туды, дзе гладзь рачная,
Дзе сплялася над затокай,
Нібы плот, лаза густая.
Стаў ля берага крутога
Над ракою нахіліўся,
Праказаў: — «Суцішь малога,
Дай грудзей... Ах, дзе ты, Крыся?»
— «Тут на дне, я, верны дружа», —
Голас чуецца дзяўчыны, —
«Адранцвела я ад сцюжы,
Выцае жвір мне вочы.
Тут я маю сваіх слугак,
Паміж хвалямі гуляю,
Ем пясок, каралы, мушак,
А расою запіваю».
Ды слуга не чуе тога,
Яшчэ ніжэй нахіліўся
Да ракі: — «Суцішь малога,
Дай грудзей!.. Ах, дзе ты, Крыся?»
Стала штосьці ў рэчцы біцца,
Зморшчылася гладзь рачная,
Замуцілася вадзіца, —
Раптам рыбка выплывае;
Над вадой мільгае іскрай,
Плаўнікі да руж падобны,
На галоўцы залацістай
Вочкі — нібы бісар дробны.
Страсянулася — на плечы
Косы русыя ўпалі,
Вочы, бы ў вясновы вечар
Ў небе зорачкі, зззялі;
Грудзі — яблык сакавіты,
Твар — яснейшы зор адвечных...
Падплывае да ракіты,
Да густых кустоў надрэчных,
І спявае памаленьку,
Да грудзей дзіцятка туліць:
— «Люлі, люлі, мой маленькі,
Люлі, мой маленькі, люлі»...
А калі дзіця суціхне —
На галінку кош павесіць,
Зноўку цела сваё сціcне,
Галаву і вочы зменшыць,
Зноў пакрыецца лускою,
Ў пер'е краснае ўбярэцца,
Плюсне ў воду —над ракою
Толькі рэха разнясецца.
Так і вечарам і ранкам,
Як слуга з дзіцём прыходзіць,
Кліч пачуўшы, Свіцязянка
Пакарміць дзіця выходзіць.
Толькі вечарам аднойчы
Затужыла рыбка-матка:
Час прызначаны пракрочыў,
А няма слугі з дзіцяткам.
Да ракі не мог прабрацца
Ён ніяк, бо той парою
Пан над рэчкай прагуляцца
Выйшаў з жонкай маладою.
За кусты слуга схаваўся,
Прачакаў да зоркі ранняй
І усё-ж не дачакаўся
Ён звароту пана з паняй.
З-пад рукі глядзеў ён доўга
Ў даль, дзе вольны шлях праходзіць,
Дзень прайшоў — няма нікога,
Шэры вечар надыходзіць.
Ноч паліла зоркі-свечкі,
І з дзіцяткам за плячыма
Падышоў слуга да рэчкі,
Сочачы здалёк вачыма.
Божа! Што на свеце стала?
Думае, спыніўшы крокі:
Там, дзе рэчка працякала,
Толькі жвір, ды роў глыбокі,
А на беразе ў шматочкі
Вопратка паноў парвана,
Не відаць на'т і слядочку
Ані пані, ані пана;
А ў затоцы пад вярбою
Нібы вырас камень белы —
Пахаваў ён пад сабою
Два людскіх забітых целы.
Задумёны і маўклівa,
Не крануўшы цішу словам,
Дзве гадзіны сіратліва
Прастаяў слуга над ровам,
І паклікаў: — «Крыся, Крыся!
Рэха «Крыся» адказала,
Гукі рэха расплыліся,
І навокал ціха стала.
Не сустрэў ён рыбкі вочы
Ў лозах, дзе лісцё сплялося;
Галавой хітнуў ён тройчы,
Нібы праказаў: збылося.
Ён да коша нахіліўся,
Усміхнуўся ён малому,
Ўзяў яго, перахрысціўся,
І пайшоў паспешна к дому.

Пераклаў К. ЦІТОЎ

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных У Заходніх абласцях БССР

У ГЭТЫЯ ДНІ НА НІКАЛАЕЎШЧЫНЕ

Прынёманская Нікалаеўшчына—радзіма нашага народнага паэта Якуба Коласа. Як ўсе ў гэтыя дні ў заходніх абласцях, Нікалеўшчына жыве зараз надыходзячымі выбарамі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Патрапаны «фіят» з ліку трафейных імчыцца ўперад, абмінаючы калгасныя падводы, гружаныя хлебам. Дарога ідзе то полем, то лесам. Тонкаю стальною ніццю бяжыць вузкакалейны чыгуначны шлях ад Стаўбцоў да цагельнага завода, адзінага індустрыяльнага прадпрыемства на тэрыторыі Нікалаеўшчыны. Лясок, узгорак— і раптам, як на далоні адкрываецца спакойны велічны Нёман. Недзе ля самага павароту, не зважаючы на восеньскае надвор'е, віднеюцца рыбацкія чаўны...

Нікалаеўшчына ў лясах. Вёска адстрайваецца. У самым цэнтры будуецца сталінская школа і дзеці амаль па днях вылічваюць час яе сканчэння.

Машына спыняецца на ўзгорку ля драўлянага доміка сельсовета. Над уваходам сцягі, лозунгі. Ніжэй на дзвярах — прыкметнае, ад рукі напісанае абвяшчэнне: «Таварышы сяляне, якія жадаюць атрымаць работы ў вугальных шахтах, могуць звярнуцца ў сельсовет».

У самым сельсовеце, які адначасна з'яўляецца і выбарчым участкам, поўна і людна. Толькі-што Міхаіл Міхайлавіч Міцкевіч, родны брат Якуба Коласа, дырэктар мясцовай школы, актыўны агітатар, закончыў складанне спісаў. Дапісана апошняя прозвішча. У спісах шмат васемнаццацігадовых, — яны будуць галасаваць упершыню, — шмат жанчын. Міхаіл Міцкевіч прымацоўвае спісы на сцяне і выбаршчыкі шчыльна падыходзяць да іх, каб праверыць свае прозвішчы. У пакоі робіцца яшчэ людней.

Сабраліся агітатары — Міхаіл Міцкевіч, Юрый Міцкевіч (настаўнік мясцовай школы), Нікалай Скорабагаты і інш. Іх больш дзесяці. Амаль усе — агітатары са стажам, працавалі ў мінулых выбарчых кампаніях, набылі вопыт. У сялянскай хаце агітатар — жаданы госць. У Нікалаеўшчыне — і гэта зусім зразумела — павышаная цікавасць да літаратуры. Вершы Якуба Коласа — свайго земляка — тут не толькі школьнікі, але і многія старыя ведаюць напамяць. Агітатары, асабліва Міхаіл Міцкевіч, часта выкарыстоўваюць літаратурныя прыклады ў часе гутаркі.

Якуб Колас часты госць у Нікалаеўшчыне. Тут яго ўсе ведаюць, ад малога да старога. Паэт дапамог падручнікамі і мастацкай літаратурай мясцовай школе. У дні выбараў у Нікалаеўшчыне будуць выпускаць насценную газету і спадзяюцца, што знатны зямляк сваім майстэрскім словам дапаможа ў правядзенні выбарчай кампаніі.

Кандыдатам у дэпутаты раённага Совета ад Нікалаеўшчынскай выбарчай акругі выстаўлен селянін Владзімір Грыгаровіч. З дзіцячых год ён на зямлі, але большасцю працаваў не на сябе, а на пана. Панскія ўлады судзілі Грыгаровіча, штрафавалі і часта асноўнай прычынай для гэтага было тое, што ён — беларус, ды яшчэ з Нікалаеўшчыны, дзе людзі дабіваліся заветнага права гаварыць, чытаць і пісаць на роднай мове. Скромны селянін-працаўнік В. Грыгаровіч ажыў з дня прыходу часцей Чырвонай Арміі. Дзень і ноч ён у сельскім камітэце, а потым у совеце. Дапамагаў расшыраць школу, перапісваў дзяцей школьнага ўзросту, склікаў іх. І нездарма зараз школа—гордасць Нікалаеўшчынскага сельсовета.

Ніколі на Нікалаеўшчыне не было арганізаванай самадзейнасці, а цяпер харавы гурток у 40 чалавек пяе вясёлыя совецкія песні, частушкі і ні адна сустрэча кандыдата ў дэпутаты са сваімі выбаршчыкамі не абыходзіцца без выступленняў мясцовых артыстаў.

Беластоцкая група пісьменнікаў, баранавіцкі абласны тэатр, Баранавіцкая радыёстанцыя прымаюць актыўны ўдзел у масава-мастацкім абслугоўванні выбаршчыкаў.

... Спускаецца лістападаўскі вечар, восеньская цемра абвалаквае Нёман, але жыццё ў Нікалаеўшчыне не заціхае. Запальваюцца агні, а ў пакоі выбарчай камісіі ўсё так-жа людна, як і ўдзень. У напружанай цішыні выбаршчыкі слухаюць гутарку аб Сталінскай Канстытуцыі.

Еф. САДОЎСКІ.

Партыйная прапаганда сярод літаратараў Мінска

Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)»— палітычны дакумент велізарнага тэарэтычнага і практычнага значэння, у аснову якога пакладзены ўказанні вялікага Сталіна. Двухгоддзе гэтай пастановы праходзіць пад знакам павышэння марксісцка-ленінскай загартоўкі партыйных і совецкіх кадраў. «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» узбройвае членаў партыі, кадры совецкіх работнікаў, нашу інтэлігенцыю марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Сталінскі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» — магутнейшы сродак ленінскага выхавання совецкай мастацкай інтэлігенцыі —пісьменнікаў, мастакоў, актораў у духу вучэння Маркса—Энгельса—Леніна —Сталіна. Партарганізацыя ССП БССР, напрыклад, у 1939 і 1940 годах дамаглася прыкметных поспехаў у партыйнай прапагандзе, у справе авалодання комуністамі і беспартыйнымі пісьменнікамі марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Тэарэтычныя канферэнцыі па асобных працах Леніна і Сталіна, якія праводзіліся партарганізацыяй, прыцягнулі ўвагу не толькі комуністаў-літаратараў, але і беспартыйных пісьменнікаў: Змітрака Бядулі, Кузьмы Чорнага і інш. Кузьма Чорны, напрыклад, на тэарэтычнай канферэнцыі па біяграфіі таварыша Сталіна прачытаў надзвычай цікавы рэферат.

На даволі высокім узроўні праходзілі тэарэтычныя гутаркі па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)», якімі кіраваў тав. Гурскі. З цікавымі рэфератамі па асобных раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» часта выступалі Хв. Шынклер, Ю. Рудзько, Г. Бярозкін, Р. Лынькоў, К. Крапіва, А. Якімовіч, А. Куляшоў.

Па ініцыятыве аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КП(б)Б, Мінскі гарком КП(б)Б арганізаваў для работнікаў літаратуры і мастацтва ўніверсітэт марксізма-ленінізма. Пісьменнікам створана дадатковая магчымасць узняцця свайго ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню, авалодання вучэннем Маркса — Энгельса—Леніна—Сталіна.

Але не ўсе таварышы зразумелі значэнне універсітэта для пашырэння свайго кругагляду, для штодзённай творчай работы. Паасобныя літаратары-комсамольцы (т. т. Мальцінскі, Груб'ян, Левановіч) нерэгулярна наведваюць універсітэт. Комсамольская арганізацыя ССП БССР не знайшла яшчэ часу растлумачыць ім недапушчальнасць такіх адносін да марксісцка-ленінскай вучобы.

Буйным недахопам у арганізацыі партыйнай прапаганды ў нас з'яўляецца адсутнасць гутарак з таварышамі, індывідуальна вывучаючымі гісторыю ВКП(б) па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)». Не наладжана сталая кансультацыя для індывідуальна вывучаючых «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Бібліятэка клуба пісьменнікаў не прыстасавана да абслугоўвання таварышоў, вывучаючых марксізм-ленінізм.

Партыйная арганізацыя ССП БССР намеціла рад мерапрыемстваў па далейшаму паляпшэнню партыйнай прапаганды. Авалоданне вучэннем Маркса—Энгельса —Леніна—Сталіна дапаможа совецкім пісьменнікам дамагчыся яшчэ большых поспехаў у творчай рабоце.

М. МОДЭЛЬ.
Сакратар партарганізацыі ССП БССР.

Універсітэт марксізма-ленінізма для работнікаў літаратуры і мастацтва гор. Мінска



Па пастанове Мінскага гаркома КП(б)Б створан універсітэт марксізма-ленінізма для работнікаў літаратуры і мастацтва гор. Мінска. Слухачамі універсітэта з'яўляюцца пісьменнікі і артысты Тэатра оперы і балета, Беларускага драматычнага і Яўрэйскага драматычнага тэатраў. Сярод слухачоў універсітэта — пісьменнікі З. Бядуля, К. Крапіва, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, К. Чорны, А. Куляшоў, народныя артысты БССР В. Уладамірскі, Р. Млодэк, П. Засецкі, заслужаныя артысты БССР Л. Рахленка, Л. Ржэцкая і інш. Універсітэт разлічан на 150 слухачоў.

Праграма навучання складаецца з «Асноў марксізма-ленінізма», «Гісторыі філасофіі», «Гістарычнага і дыялектычнага матэрыялізма», «Усеагульнай гісторыі» і «Мастацтвазнаўства». Курс універсітэта разлічан на 14 месяцаў. Працуе універсітэт штотыднёва па панядзелках.

18 лістапада адбыліся першыя заняткі ўніверсітэта. Акадэмік С. Я. Вальфсон прачытаў лекцыю на тэму «Аб матэрыялізме старажытнага свету», батальённы камісар тав. Цурыкаў зрабіў даклад «Аб міжнародным становішчы». Лекцыя і даклад былі выслуханы з вялікай увагай.

На здымку: На дакладзе тав. Цурыкава аб міжнародным становішчы.

Фота І. Шышко. (БелТА).

Адам Міцкевіч

Да 85-годдзя з дня смерці

★

Д. Савановіч

★

Он между нами жил...
Он посещал беседы наши.
. . . . .Нередко
Он говорил о временах грядущих,
Когда народы, распрю позабыв,
В великую семью соединятся.
А. Пушкін.

Ідэя дружбы народаў, гарачая прапаведзь гуманізма, бязлітасная крытыка палітычнай рэакцыі высунулі Адама Міцкевіча ў першыя рады ўсееўрапейскай літаратуры 20—30-х год XIX стагоддзя. Яго творчасць з'явілася адлюстраваннем дэмакратычных тэндэнцый польскага нацыянальна-вызваленчага руху 20—60-х год.

Велізарная рэвалюцыйная роля гэтага руху неаднаразова падкрэслівалася Марксам і Энгельсам, знаходзіў ён падтрымку і з боку рэвалюцыйных сіл Расіі: яму спачувалі дзекабрысты, Герцэн і рэвалюцыянеры-шасцідзесятнікі. Рух гэты быў не аднолькавы па сваіх задачах: у ім змагаліся нацыяналістычна-дваранскія элементы з дэмакратычнымі. Гэта прывяло да абмежавання яго соцыяльнай базы: асноўнай масе польскага народа былі чужды вузка-нацыяналістычныя і саслоўныя інтарэсы яго главароў. У гэтым быў яго слабы бок, які ўсугубляўся тым, што рух у цэлым выступаў з памылковым лозунгам аднаўлення Польшчы ў яе старых граніцах.

Творчасць А. Міцкевіча ўзнікла пад уплывам асветніцкага руху першай чвэрці XIX стагоддзя, цэнтрам якога быў Віленскі універсітэт.

З паступленнем у Віленскі універсітэт у 1815 годзе Міцкевіч становіцца адным з арганізатараў рэвалюцыйнага студэнцкага гуртка. Гурток гэты аформіўся ў 1817 годзе і спачатку праследваў чыста асветніцкія мэты. Сюды ўваходзілі такія дзеячы, як Ян Чачот, Тамаш Зак і інш. Гурток гэты ставіў перад сабою перш за ўсё этычныя мэты, задачу выхавання асобы ў духу гуманізма і народніцтва. Рух польскай моладзі гэтага часу быў свайго роду праявай «Штурм унд Дранг», («бура і націск») ён суправаджаўся сцвярджэннем культу асобы, сцвярджэннем пачуцця. Ён знаходзіў ідэалагічную апору ў філасофіі Канта, у паэзіі Шылера, у песнях нямецкіх буршаў.

Першыя літаратурныя вопыты Міцкевіча былі звязаны з польскім класіцызмам. К пачатку 20-х год усё мацней пачынаюць гучаць у яго ноты шылераўскага гуманізма і рамантызма. Міцкевіч стварае ў гэтыя годы рад вершаў, заклікаючых моладзь к подзвігам, прасякнутых жыццёсцвярджаючым пачуццём.

Высокі маральны ідэал пазбаўлен у Міцкевіча рысаў аскетызма. У вершы «Будзем карыстацца жыццём» ідэя маральнай дасканаласці і грамадзянскасці спалучаецца з заклікам да пачуццёвай асалоды радасцямі жыцця.

Паралельна з гэтым струменем, творчасць Міцкевіча фарміруецца ў канцы 10-х, пачатку 20-х год пад уплывам гістарычных дум Ю. Немцэвіча, адкуль ідзе пафас грамадзянскага подзвігу, і рамантычнай ідэі народнасці. Гэтыя два ўплывы скрыжоўваюцца ў творах ковенскага перыяду (1820—1823), калі была напісана большасць балад і «Гражына».

У падыходзе к старажытнасці і вуснай народнай творчасці Міцкевіч праяўляе самастойныя рысы. Міцкевіч падпарадкоўвае фальклор сучаснасці: для яго ён — сродак выхавання чалавечага характару ў святле тых задач, якія ўзнікаюць у працэсе барацьбы за рамантычны ідэал свабоды і дабрадзейнасці. З гэтым, сапраўды дэмакратычным, падыходам да фальклору звязаны тыя рысы рэалізма, якія захоўвае Міцкевіч у межах умоўна-рамантычнай формы. Большасць балад Міцкевіча захоўвае каларыт мясцовасці, з якой звязаны апрацаваныя ім паданні: сюжэты балад групіруюцца, галоўным чынам, вакол Навагрудка, Тугановіч, Цырына, возера Свіцязь, паэт рэалістычна узнаўляе прыроду гэтай мясцовасці.

Дзейнасць Міцкевіча і яго сяброў была заўважана царскім урадам. У 1823 годзе Міцкевіч, які працаваў у той час настаўнікам у Коўне, быў арыштаван. У канцы 1824 года Міцкевіча высылаюць у Расію, дзе ён жыве да 1829 года: спачатку ў Пецярбургу, затым ў Одэсе, Маскве і зноў у Пецярбургу. У гэты час Міцкевіч знаходзіцца ў дзейснай сувязі з перадавой рускай грамадскасцю і літаратурай. У Расіі ён знаходзіць разуменне і прызнанне з боку дзекабрыстаў, Пушкіна, Вяземскага, Н. Палявога, Пагодзіна.


Пад уплывам рускай абстаноўкі, у сяброўстве з новымі прыяцелямі складваецца ў Міцкевіча ідэал дружбы і братэрства народаў. У Расіі Міцкевіч пераконваецца, што перад рускім і польскім народам стаіць адзін агульны вораг: самадзяржаўе, дэспатызм, прыгонніцтва. З часам, будучы ў эміграцыі, Міцкевіч піша верш «К рускім прыяцелям». Разам з вобразамі пакараных і сасланых палякаў перад ім устаюць любімыя ім пакутніцкія цені яго рускіх прыяцеляў: Рылеева, Бестужэва, і ён пасылае брацкае прывітанне дзекабрыстам у снягі Сібіры і праклянае дэспатам.

Жыццёсцвярджаючае пачуццё і палымнеючая прага свабоды, гуманізм Міцкевіча сустракаюцца ў Расіі з блізкімі матывамі, якія ідуць ад Пушкіна; ідэал грамадзянскага абавязку, які праяўляецца ў «Гражыне», «Свіцязі» пераклікаецца з матывамі паэзіі дзекабрыстаў; зварот к народнасці, к фальклору збліжае яго з Пушкіным і Жукоўскім. Разам з рускай літаратурай Міцкевіч перажывае захапленне байранізмам і крызіс рамантызма, разам з рускай літаратурай выходзіць ён на шляхі рэалізма.

Байранічны настрой паэта сказаўся ў «Крымскіх санетах», дзе на фоне велічнай прыроды, увасобленай у гіпербалічна-яркай вобразнасці, праходзіць фігура выгнанніка, які сумуе па сваёй Літве. У «Канрадзе Валенродзе» (1827—1829) найбольш ярка сказаліся рысы байранаўскага стылю; разам з тым паэма гэта выкрывае байранічнага героя і сведчыць аб крызісе рамантызма Міцкевіча.

Для Міцкевіча ў 20-я гады з усёй вастрынёй устала праблема палітычнага адраджэння Польшчы. Актывізацыя палітычных сіл Польшчы напярэдадні паўстання 1830 года патрабавала ад паэта яго слова. Адраджэнне Польшчы было яго заветнай марай, але жывое пачуццё рэчаіснасці падказвала яму, што спробы адрадзіць Польшчу былі асуджаны на няўдачу, як з прычыны несуразмернасці сіл Польшчы з сіламі ворагаў, так і з прычыны адсутнасці шырокай народнай базы для паўстання. Гэта абумовіла трагічную пастаноўку праблемы ў «Канрадзе Валенродзе».

Польскі нацыянальна-вызваленчы рух з самага пачатку свайго існавання, не маючы моцнай апоры ў народзе, стаў на шлях прыстасавання да палітычнага ладу дзяржаў-пераможцаў з мэтай ажыццяўлення сваіх нацыяналістычных ідэалаў пры



Адам Міцкевіч. Малюнак мастака Н. Гурло.

дапамозе той «мірнай» улады, якую атрымалі некаторыя асобы, і адначасна апеліраваў к заходнееўрапейскім дзяржавам, галоўным чынам, к Францыі, чакаючы ад яе падтрымання сваіх замыслаў. Міцкевіч у сваёй рамантычнай паэме, ва ўмоўнай форме, паказвае гэту асаблівасць польскага руху.

Герой яго паэмы — Канрад Валенрод у маленстве быў узят у палон нямецкімі рыцарамі і атрымаў у іх выхаванне; адначасова з гэтым ён знаходзіўся пад уплывам палоннага літоўскага песняра, які распальваў у ім нянавісць да немцаў і абуджаў да помсты. Пры зручным выпадку Канрад бяжыць к літоўцам, але, зразумеўшы тут несуразмернасць змагаючыхся сіл, вырашыў цаною маральнай гібелі сваёй асобы выратаваць радзіму: ён пайшоў назад к немцам, заслужыў давер'е ордэна і, разлажыўшы яго знутры, прывёў к гібелі ў вайне з літоўцамі. Так у рамантычным вобразе Канрада быў паказан рэальны тып польскага нацыяналіста, адарванага ад народа, які становіцца на коўзкі шлях здрадніцтва.

Міцкевіч у «Канрадзе Валенродзе» асудзіў гэты шлях. Адносіны да Канрада ў яго супярэчлівыя: Міцкевіч апраўдвае Канрада, паколькі яго здрада выходзіла з чыстай крыніцы любві да радзімы, але ён-жа і асуджае яго з пункту гледжання сваіх гуманістычных, эпічных ідэалаў за яго пагібельны для чалавека шлях. Але Міцкевіч не здолеў выйсці за рамкі той абмежаванасці, у якія яго ставіла эпоха: шырокага народнага руху на карысць адраджэння Польшчы не было.

Таму напярэдадні паўстання Міцкевіч не вырашыў да канца стаяўшую перад ім праблему. А, між тым, жыццё патрабавала ўвязкі гуманістычных, этычных імкненняў асобы з праблемай нацыянальнай і соцыяльнай барацьбы. У вобразе Канрада адлюстраваўся і гэты другі бок польскага нацыянальнага руху: той гуманізм і культ асобы, з якога выйшаў Міцкевіч. Ідэя помсты жыве ў Канрадзе як пачуццё абавязку, у прынцыпе-ж ён, Канрад, узняўся над абмежаванымі нацыянальнымі ідэямі, імкнецца да паўнаты асабістага быцця, якое яму рысуецца не ў нацыянальным, а ў чалавечым ідэале. «Даволі помсты — немцы ж таксама людзі!» — ускліквае ён у выніку сваёй здрады. Здрадніцтва ўнутрана выпустошвае Канрада: ён робіцца чужым і ў лагеры немцаў і ў лагеры літоўцаў. Пастаўлены, такім чынам, па-за грамадскімі сувязямі Канрад шукае апоры толькі ў адным пачуцці кахання да жанчыны. Паралельна з грамадзянскай драмай развіваецца драма кахання Канрада і Альдоны.

Альдона, дачка князя Кейстута і жонка Канрада, пасля адыходу апошняга к немцам добраахвотна асуджае сябе на затворніцтва ў Марыенбургу, цэнтры ордэна, у надзеі бачыць Канрада. Сустрэўшы Альдону ў Марыенбургу, Канрад кожны вечар ходзіць к вежы, дзе праходзіць яе затворніцтва, і праводзіць час у гутарцы з ёю. Каханне да Альдоны аслабляе ў ім ідэю помсты, у ёй адной бачыць ён сэнс свайго жыцця. Вярнуўшыся з паходу ўнутрана спустошаным, выканаўшы свой абавязак, ён заклікае Альдону ўцячы з ім ад барацьбы і ад людзей на ўлонне прыроды, у Белавежскую пушчу. Так звужваецца гуманістычны ідэал у тым выпадку, калі ён не знаходзіцца ў гармоніі з інтарэсамі грамадства, народа. І Міцкевіч адкідае і гэты шлях Канрада.

Так Міцкевіч пераадольвае культ моцнай байранічнай асобы псіхалагічным аналізам яе душы. У 1827—28 годах ён разам з Пушкіным завяршае рамантычны этап свайго развіцця, крыху пазней апошняга. З гэтага часу Міцкевіч шукае станоўчага героя ў тым-жа напрамку, што і Пушкін: ён шукае яго ў звычайнай абстаноўцы, сярод скромных непрыкметных людзей, у канкрэтна-гістарычных умовах. Так узнікае славутая эпапея ў вершах «Пан Тадэуш», якая ствараецца ў 1832—34 годах.

Тут Міцкевіч разгортвае шырокую карціну шляхецкага дробнапамешчыцкага жыцця пачатку XIX стагоддзя. Перад намі ўзнікае гістарычна правільная карціна эпохі напалеонаўскага нашэсця: надзея на аднаўленне Польшчы, патрыятычны ўздым і на гэтым фоне карціна шляхецкай ганарлівасці, дробных сварак і тэма бязсэнснай варожасці двух сямей, якая прыводзіць да аднаўлення «заездаў», г. зн. дробных шляхецкіх войн. З аб'ектыўнасцю рэаліста паказаў Міцкевіч адраджэнне «шляхецкіх» традыцый польскага дваранства і няздольнасць шляхты, гэтай соцыяльнай апоры вызваленчага руху, справіцца з ускладненымі на яе гісторыяй задачамі. Аднак, у гэтым-жа патрыярхальным дробнапамешчыцкім асяроддзі Міцкевіч знайшоў сваіх станоўчых герояў. Яны выступаюць у асобе Тадэуша і Зосі.

Тадэуш — звычайны, але сумленны, маральна і фізічна здаровы юнак. Ён атрымаў выхаванне ў Вільні. У ім жыве стыхійны дэмакратызм. Ён марыць аб мірным жыцці і працы ў вёсцы, аб шчасці сямейнага жыцця, марыць аб вызваленні сялян. Гэта тып польскага юнака дваццатых год, які, падобна Міцкевічу і яго прыяцелям, шукаў маральнага ідэалу ў працы, скромнасці, дэмакратызме. У ім жыве стыхійная любоў да радзімы. Напярэдадні 1812 года ён ідзе ў польскія легіёны Напалеона. Яго нявеста Зося — тып скромнай правінцыяльнай дзяўчыны, якая жыве інтарэсамі дома, сям'і, але аддана бацькаўшчыне.

Калі Міцкевіч стварыў сваю эпапею, яго захапляў ідэал незалежнага, скромнага працоўнага жыцця ў вёсцы пры ўмове спрыяючага выражэння хваляваўшых яго ў той час праблем, соцыяльных і нацыянальных. Як бачым, яго ідэал асабістага жыцця супадае з Пушкінскім ідэалам: яго зварот к правінцыі і к яе непрыкметным героям адпавядае пушкінскім пошукам; яго Тадэуш і Зося блізкі, у нейкім сэнсе, Грынёву і Машы Міронавай; яго гістарычны метад соцыяльна-бытавога рамана блізкі к метаду «Еўгенія Онегіна» і «Капітанскай дачкі». Калі нельга гаварыць аб простым уплыве іх адзін на другога, то несумненны факт агульнасці мастацкіх установак, якія маглі выпрацавацца пры ўзаемнай сувязі.

Такім чынам у «Пане Тадэушу» Міцкевіч вырашыў праблему станоўчага героя, але на матэрыяле гістарычным. Для сучаснасці праблема заставалася адкрытай. Міцкевіч — мастак стаў афярай супярэчнасцей нацыянальна-вызваленчага руху Польшчы. Пасля «Пана Тадэуша» ён нічога больш не стварыў. Пасля выезду з Расіі жыццё яго працякала ў эміграцыі. У цяжкой атмасферы ўнутраных супярэчнасцей Міцкевіч выступаў то як гарачы рыцар свабоды, які арганізуе польскі легіён для паўстання італьянцаў, то як прапаведнік рэакцыйнай і містычнай тэорыі маральнага ўдасканалення і тэорыі месіянізма Польшчы. 26 лістапада 1855 года ён памёр у Канстанцінопалі, куды прыехаў для арганізацыі легіёнаў і ўдзелу ў Крымскай вайне супроць рускіх.

У «свабоднай» Польшчы версальскай сістэмы супярэчнасці, хваляваўшыя Адама Міцкевіча, вырашаны не былі. Гісторыя яшчэ раз паказала асуджанасць палітычнай сістэмы, адарванай ад народа. Мары найвялікшага нацыянальнага паэта Польшчы і песняра дружбы народаў знайшлі сваё ажыццяўленне толькі ў Савецкім Саюзе.

Адам Міцкевіч

ТРЫ БУДРЫСЫ

Літоўская балада

Стары Будрыс трох сынаў,
Як сам, гэткіх літвінаў,
Да сябе на дзядзінец паклікаў,
Ды ім кажа: — «Зважайце,
Коні борзда сядлайце,
Натачыце мячы ў міг і пікі!

«З Вільні вестку мне далі,
Што ўжо там наказалі
Тры вайны на тры свету староны:
Ольгерд рускіх біць едзе,
Скіргел — ляхаў суседзяў,
А князь Кейстут разгроміць Тэўтоны.

«Вы, адважныя хлопцы,
Паслужыце старонцы,
Хай вядуць вас літоўскія богі!
Застаюся я дома,
Дам вам раду, вядома:
Трох вас ёсць і тры ёсць вам дарогі.

«Хай адзін у Расію
За Ольгердам шлях крые,
Па-над Ільмень, пад мур Наваграду;
Там саболлі апоны,
Залатыя заслоны,
І ў купцоў там чырвонцаў, як лёду.

«Хай да князя Кейстута
Другі едзе, а хутка,
Крыжакоў хай знішчае дашчэнту!
Як пяску, там бурштынаў,
Сукны дзіўнай тканіны,
І там рызы ў ксяндзоў ў дыяментах.

«Мусіць к Скіргелу трэці
Па-за Нёман ляцеці,
Беднату там убачыць ліхую,
Але возьме за тое
Узбраенне стальное,
І мне стуль прывязе сынавую.

«Бо з нявольніц мне толькі
Спадабаліся полькі, —
Так панадны мне стан іх дзявочы,
Твар іх бела-ружовы,
Як смоль, чорныя бровы,
Як дзве зоркі іх свецяцца вочы.

«Маладым чалавекам
Я адтуль прад паўвекам
Сабе вывез палячку за жонку;
Хоць яе пахаваў я,
Усё яшчэ ўспамінаю,
Калі гляну я ў тую старонку».

Даўшы так засцярогу,
Блаславіў на дарогу:
Яны ўзялі бронь, селі, пабеглі.
Ужо й зіма надыходзе, —
Сын не едзе ніводзін, —
Будрыс думаў, што ў бітвах палеглі.

Па снежыстай дарожцы
Мчыцца ў зброі хтось к вёсцы,
А пад буркаю нешта хавае:
— «Кубел — гэта, знаць, ноша,
А ў ім рускія грошы».
— «Татка, — полька, твая сынавая!»

Па снежыстай дарожцы
Мчыцца ў зброі хтось к вёсцы,
А пад буркаю нешта хавае.
— «Мусіць, з Прусаў, мой сыну,
Цягнеш кубел бурштыну?»
— «Татка, полька, твая сынавая!»

Па снежыстай дарожцы
Трэці нехта мкне к вёсцы,
А пад буркай вяліка здабыча.
Будрыс — што? — не пытае,
Толькі госці склікае,
На вяселле іх трэцяе кліча.

Пераклаў Янка КУПАЛА.

Міцкевіч у музыцы

★

Н. Шчэглоў

★

Натхнёная творчасць геніяльнага польскага паэта Адама Міцкевіча мае вельмі цеснае ўзаемадачыненне з музыкальным мастацтвам. З ранняга маленства Міцкевіч увайшоў у круг жыцця і быту трох народаў: польскага, беларускага і літоўскага. З скарбніцы польскага, беларускага і літоўскага фальклору, з іх сказанняў, легенд, былін, казак і песень ён чэрпаў выдатныя матывы для свайго паэтычнага даравання.

Міцкевіч — адзін з тых мастакоў, якія глыбока ведалі, любілі і цанілі творчасць народа.

Родное слово, речь народа,
Язык средь жизненного хода,
Стоишь ковчегом ты святым.
И служишь сводом сопряженья,
Заветом вечного сближенья
Между отжившим и живым.
В твои хранительные грани
Народ слагает в виде дани
Всю жизнь свою, свои мечты,
Геройский меч питомца брани,
Понятий нити, мыслей ткани
И чувства свежие цветы.
Никто не сломит, не раздавит
Ковчег сей дивный...

Прыведзеныя радкі паэта як нельга больш пераканаўча гавораць аб тым глыбокім пранікненні ў народную творчасць, якое было адной з адзначных рысаў сувязі Міцкевіча з народам.

Паэтычныя народныя паданні былі першымі сюжэтамі творчасці Міцкевіча. Легенды, што акружалі бурлівую Свіцязь, паслужылі тэмай для балады Міцкевіча «Свіцязянка». Гэты твор (у перакладзе Мея) натхніў выдатнага рускага кампазітара Рымскага-Корсакава на буйны музычны твор «Свіцязянка» — кантату для хора, салістаў і аркестра.

Цудоўная прырода была ўлюбёнай тэмай вершаў Міцкевіча.

Попари, Кушелево, Свитязь
И Беловежской пущи сень,
Бессмертны вы...

Аб радзіме, сваім народзе, яго выдатных фальклоры, роднай прыродзе Міцкевіч ніколі не забываў і ў перыяд сваіх вандраванняў, у выгнанні. Наадварот, у чужых краінах ён яшчэ выразней адчуваў іх і імкнуўся да іх:

Теперь, Литва, твою красу я
Постиг и вижу всю вполне.
В чужом краю тебя рисую,
Когда тоска жмет сердце мне.

У бытнасць сваю ў Парыжы Міцкевіч трапляе ў асяроддзе выдатных людзей свайго часу. Тут адбылося яго блізкае знаёмства з геніяльным польскім кампазітарам Шапэнам. Яно мела істотны ўплыў на творчасць Шапэна. Карэнні тут відавочна трэба шукаць як у супольнасці народна-мастацкіх вытокаў іх творчасці, так і ў аднолькавым трагічным лёсе гэтых двух геніяльных выгнаннікаў, якія страсна любілі радзіму і свой народ і асуджаны былі капіталістычным ладам на жыццё і смерць далёка ад іх.

Уплыў Міцкевіча ў творчасці Шапэна асабліва моцна і поўна відаць на славутых шапэнаўскіх баладах, музыкальна-паэтычныя вобразы якіх пераклікаюцца са зместам балад Міцкевіча. Тыя і другія прасякнуты духам народнай польскай паэзіі.

Другі зямляк Міцкевіча, польскі кампазітар Манюшка ўвасобіў у сваёй музычнай творчасці цудоўныя «Крымскія санеты» Міцкевіча з іх красачнымі зарысоўкамі пейзажаў і глыбокіх чалавечых перажыванняў.

Лірычная паэзія Міцкевіча прыцягвала да сябе і знаходзіла адлюстраванне ў творчасці многіх славутых рускіх кампазітараў. Група рускіх паэтаў на чале з вялікім Пушкіным, выключна цаніўшыя асобу і талент Міцкевіча, паклала пачатак перакладам яго твораў, што яшчэ больш спрыяла іх масаваму распаўсюджанню. Першым рускім кампазітарам, палажыўшым на музыку вершы Міцкевіча, быў Глінка, які напісаў песню-раманс «Жаданне» («Калі ў час вясёлы») ў плане далікатнай, дасціпнай мазуркі. Пасля Глінкі на тэксты Міцкевіча пісалі творы кампазітары Рымскі-Корсакаў («Свіцязянка»), Чайкоўскі («На зямлю сумрак паў») і інш. Найбольшым поспехам карыстаўся грацыёзны, тонкі верш Міцкевіча «Мая балаўніца» — ён знайшоў увасабленне амаль ва ўсіх рускіх кампазітараў, пісаўшых музыку на яго тэксты (Глінка, Рымскі-Корсакаў, Чайкоўскі і інш.).

У рамансавай творчасці на словы Міцкевіча асаблівае значэнне набывае цыкл рамансаў кампазітара Кюі. Яму ўдалося найбольш глыбока і ярка адчуць і выявіць паэтычную лірычнасць вершаў геніяльнага паэта-рамантыка («Зморнаваная горам», «Мая балаўніца» і інш.). Рамансы на тэксты Міцкевіча — лепшыя і каштоўнейшыя старонкі ў вакальнай творчасці Кюі. Яны па-праву займаюць асобнае месца ў рускай рамансавай літаратуры мінулага.

Памяць аб вялікім паэту Міцкевічу, яго цудоўная муза, якая кліча чалавецтва да радасці, да свабоды, да лепшых прагрэсіўных пачуццяў, да волевых моцных перажыванняў, яго глыбокая, цёплая, залушэўная лірыка, яго любоў к народу, к радзіме назаўсёды захаваюцца ў народзе. Яго выдатныя сюжэты бясспрэчна знойдуць больш поўнае ўвасабленне ў творчасці савецкіх кампазітараў і ў першую чаргу кампазітараў заходніх абласцей Беларусі, кампазітараў Савецкай Літвы.



Дом бацькоў Адама Міцкевіча ў Навагрудку, Баранавіцкай вобласці. К 85-годдзю з дня смерці паэта адкрываецца мемарыяльны музей яго імя.

Фота В. Лупейкі (БелТА).

І. Кузьмін

ВЫКЛЮЧНА РЭДКАЯ КНІГА

Вядомы беларускі пісьменнік Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч у пяцідзесятыя годы XIX стагоддзя задумаў пазнаёміць беларускага селяніна з адным з буйнейшых твораў вялікага польскага пісьменніка Адама Міцкевіча — вядомай паэмай яго «Пан Тадэуш». З гэтай мэтай ён прыступіў да перакладу паэмы на беларускую мову. У 1858 годзе В. Дунін-Марцінкевіч прадставіў у Віленскі цэнзурны камітэт рукапіс перакладу першых трох песень «Пана Тадэуша» у трох сшытках. Цэнзурны камітэт, разгледзеўшы рукапіс, ухваліў да друку першыя два сшыткі ў тым-жа годзе, а трэці — у студзені 1859 года.

Гаспадар Віленскай друкарні А. Сыркін у тым-жа 1859 годзе надрукаваў дзве першыя песні паэмы асобнай кнігай і, прадставіўшы ў Цэнзурны камітэт патрабуемую законам колькасць друкаваных экземпляраў, прасіў камітэт аб выдачы яму білета на выпуск кнігі ў свет. Зусім нечакана на шляху к паяўленню кнігі ў продажы ўзніклі сур'ёзныя перашкоды. Кніга была надрукавана на беларускай мове, але польскім шрыфтам. Цэнзурны камітэт пачаў сумнявацца ў тым, што кніга на беларускай мове, але надрукаваная польскім шрыфтам, можа быць выпушчана ў свет, і звярнуўся ў Пецербург да міністра народнай асветы за растлумачэннем.

У кастрычніку 1859 года міністр народнай асветы паведаміў папячыцеля віленскай вучэбнай акругі, што Галоўнае ўпраўленне цэнзуры па справе аб надрукаванні перакладу Міцкевіча пастанавіла: у будучым не дапускаць ужывання польскага шрыфту пры друкаванні твораў на беларускай мове, а надрукаваную ўжо кнігу Дуніна-Марцінкевіча не выпускаць у свет. У лістападзе 1859 года А. Сыркін, згодна патрабавання Віленскага цэнзурнага камітэта, прадставіў яму ўсё надрукаванае выданне кнігі Марцынкевіча ў колькасці 1.000 экземпляраў. Далейшы лёс гэтых экземпляраў невядомы. Паводле пазнейшых вестак, усе яны былі знішчаны.

Так скончылася спроба пазнаёміць беларускі народ з творам вялікага польскага паэта шляхам перакладу яго на родную мову беларуса.

Забарона друкаваць кнігі на беларускай мове польскім шрыфтам заставалася ў сіле да 1905 года. Толькі пасля рэвалюцыі гэтага года выдаўцы атрымалі магчымасць друкаваць беларускія творы кірыліцай і лацінінай.

У 1907 — 1908 годы беларускае кнігавыдавецтва ў Пецербургу «Загляне сонца і ў наша ваконца» надрукавала перакладзенага Марцінкевічам «Пана Тадэуша» другім выданнем. У прадмове да кнігі выдаўцы паведамлялі, што экземпляры першага выдання кнігі не ўбачылі свету: яны былі затрыманы і спалены, засталіся цэлымі толькі дзве-тры кніжкі. Па аднаму з астаўшыхся ў палацы экземпляраў, які захоўваўся ў бібліятэцы Кракаўскага універсітэта, пецербургскае выдавецтва, па яго словах, і надрукавала другое выданне кнігі.

Ніхто з літаратуразнаўцаў не праверыў, ці сапраўды ў бібліятэцы Кракаўскага універсітэта ёсць экземпляр «Пана Тадэуша» у перакладзе Марцынкевіча першага выдання. Да апошняга часу гісторыкі беларускай літаратуры паўтаралі паведамленне выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца». Ніхто з пісаўшых аб гэтым творы Марцінкевіча не ўказаў дакладна, ці ёсць у сапраўднасці дзе-небудзь экземпляр выдання 1859 года.

Аўтару гэтых радкоў удалося ўстанавіць адносна віленскага выдання перакладу Марцінкевіча наступнае.

З багацейшых кніжных скарбніц Савецкага Саюза ні бібліятэка Акадэміі навук СССР, ні Дзяржаўная бібліятэка СССР імя В. І. Леніна (у Маскве) не маюць гэтага выдання. Адзіны пакуль экземпляр выдання 1859 года ёсць у Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М. Е. Салтыкова-Шчэдрына (у Ленінградзе). З прычыны выключнай рэдкасці кнігі паведамляем дакладныя весткі аб ёй.

Кніга захоўваецца пад шыфрам: «12.XLIII.7.143». Яна мае невялікі фармат у восьмую долю ліста. У ёй 116 старонак тэксту і 4 ненумераваных старонкі пасля тэксту, на якіх надрукаван спіс падпісчыкаў на кнігу. Вокладка зялёная.

Дакладны тэкст тытульнага ліста такі. Па беларуску: «Пан Тадэуш. Дванаццаць шляхецкіх быліц напісаў Адам Міцкевіч. Перавярнуў на беларускую гаворку Вінцэнт Дунін Марцінкевіч». Па-польску: «Сшытак першы. Вільня. У друкарні А. Сыркіна. 1859. Вокладка часовая».

На адвароце тытульнага ліста наступны цэнзурны дазвол (па руску): «Друкаваць дазваляецца з тым, каб па надрукаванні прадстаўлена была ў Цэнзурны Камітэт узаконеная колькасць экземпляраў. — Вільня. 28 мая 1858 года. Цэнзар Павел Кукальнік».

На наступным лісце такое прысвячэнне (па польску): «Землеўласнікам і мужыкам з-над Дняпра, Дзвіны, Бярэзіны, Свіслачы, Віліі і Нёмана гэту працу прысвячае перакладчык».

На старонцы 7 — 8 надрукавана прадмова перакладчыка на польскай мове. Прадмова гэта ў пецербургскім выданні надрукавана ў перакладзе на беларускую мову, але пераклад недакладны і з пропускамі. Мы апускаем прадмову.

Тэкст перакладу двух першых раздзелаў паэмы заканчваецца на старонцы 105. Далей ідуць заўвагі па вынасках з тэксту. Заўвагі на беларускай мове. У пецербургскім выданні яны былі надрукаваны пад адпаведнымі месцамі тэксту, унізе старонак.

На апошніх чатырох ненумераваных старонках надрукаван спіс падпісчыкаў на кнігу. У алфавітным парадку надрукавана 79 падпісчыкаў. У ліку іх ёсць памешчыкі, урачы, чыноўнікі, ксяндзы, настаўнікі і тры селяніны. У выданні 1908 года спіс гэты не быў надрукаван.

Г. Вольпе

Рэволюцыйная дзейнасць Міцкевіча ў 1848—1849 г.

Удзел Адама Міцкевіча ў барацьбе за свабоду ў перыяд паўстанняў 1848—1849 гадоў заўсёды выклікаў замяшанне і канфуз у польскай буржуазнай літаратурнай крытыкі. А. Міцкевіч у гэты перыяд зрабіўся інтэрнацыяналістам, перамог у сабе не адно ваганне, што было для яго абвяржэннем сваёй класавай ролі ідэйнага абаронца пануючых класаў. Польскай буржуазіі і польскай шляхце не быў патрэбен Міцкевіч—дэмакрат альбо рэволюцыянер. Трэба было адпаведным чынам «прэпарыраваць» яго, каб сцішыць альбо заглушыць гнеўны голас яго пратэсту супроць уціску і эксплаатацыі.

Тонкай аперацыі падпала палітычная дзейнасць Міцкевіча ў 1848—1849 годах. Кансерватыўныя крытыкі проста абміналі гэты перыяд у жыцці паэта, альбо тлумачылі яго як мінутнае захапленне.

***

«Чырвоным Адамам» назваў Міцкевіча рэакцыйны паэт Зыгмунт Красінскі. Ён не памыляўся, даючы гэта азначэнне. Пасля падаўлення лістападаўскага паўстання 1831 года Міцкевіч апынуўся за граніцай як палітычны эмігрант. Ва Францыі ён пераканаўся, што ў Еўропе вырасла грамадская сіла, не менш за царызм варожая народнай свабодзе, — капіталізм, і далучыўся да вялікай арміі бунтаўнікоў, якія бачылі ў соцыялізме магільшчыка капіталістычнага ладу. Ужо ў 30-х годах ён з запалам вывучае творы французскіх соцыялістаў-утапістаў. Не раз яго бунт супроць грамадска-палітычнай крыўды ўбіраўся ў рэлігійныя шаты. Але нарастаўшы ў 40-я годы рэволюцыйны рух вабіў паэта ўсё больш. Водгаласы падземнага грому надыходзіўшай буры паскорылі радыкалізацыю ў яго поглядах. У парыжскіх лекцыях аб славянскай літаратуры каротка і зласліва ахарактарызаваў ён буржуазных эканамістаў: «Не ведаюць яны, што такое каштоўнасць, што капітал. Затое добра ведаюць як карысна мець капітал, і не скупяцца на парады бедным, гэта значыць, не маючым капітала. Парады гэтыя, хоць іначай выказаныя, аднолькавы з ксяндзоўскімі. Так, як і тыя, яны гавораць: бедалага, памірай». (Даклад ад 15 сакавіка 1844 года). Хоць і пад уплывам соцыялістаў-утапістаў ствараў Міцкевіч свой палітычны сімвал веры, але яго абураў іхны пацыфізм і расслаблены гуманітарызм: «Страшэнна памыляюцца яны, думаючы, што можна знішчыць зло, не абвяшчаючы яму вайны». (Даклад ад 7 лютага 1844 года).

За некалькі год да лютаўскай рэволюцыі 1848 года Міцкевіч канчаткова парваў і з крышыўшым яго волю містыцызмам. З нецярплівасцю чакае ён, калі «ад усёй палітычнай збудовы Еўропы не застанецца каменя на камені», як прадказваў ён яшчэ ў 1832 годзе.

Лютаўская рэволюцыя застае яго ў Рыме. Па ўсёй Еўропе разлілася тады хваля вызваленчага руху. Падымаюцца да барацьбы прыгнечаныя народы. Барацьба за свабоду і незалежнасць ідзе побач з выступленнямі рабочых мас у Францыі, Германіі, Аўстрыі. На хвалі гэтага рэволюцыйнага руху вырастае Міцкевіч — чалавек, палітычны дзеяч, які служыў не аднаму народу, як дагэтуль, а ўсім, прыгнечаным дэспотыяй, — служыў не толькі паэзіяй, але і дзеяннем. Ён стаў сярод тых, хто ішоў у першых радах. Маючы 50 год, вычарпаны фізічна і маральна, ён перажывае незвычайны ўздым юнацкай энергіі.

Ужо ў сакавіку 1848 года ён арганізуе польскі легіён, як вайсковую часць, прызначаную для барацьбы за свабоду і незалежнасць Італіі. Яго рэволюцыйны размах падаграюць водгаласы парыжскіх падзей. Вядомы словы Міцкевіча, гнеўна прамоўленыя да рымскага папы: «Ведай, што дух божы сёння ў блузах парыжскага народа». У пісьме да Мадзіні ён заяўляе, што польскі легіён — «гэта армія рэспубліканская і соцыялістычная». У «Палітычным сімвале», укладзеным у выглядзе праграмы для італьянскага легіёна, ён заклікае польскіх салдатаў, каб яны змагаліся за «вольнае слова», за роўнасць усіх у будучай Польшчы. Смела гучыць наступнае пажаданне паэта: «Кожнаму славяніну, які жыве ў Польшчы, братэрства, грамадзянства, роўныя з усімі правы. Ізраільцяніну, старшаму брату, ушанаванне, братэрства, дапамога. Роўнае ва ўсім права. Таварышцы жыцця, нявесце, братэрства і грамадзянства, роўныя ва ўсім правы».

Крывавае паражэнне, якое пацярпеў парыжскі пролетарыят у чэрвеньскія дні 1848 года, не астудзіла рэволюцыйнага духу Міцкевіча. У 1849 годзе ён арганізаваў у Парыжы вялікую газету на французскай мове з мэтай пашырэння ідэй соцыялізма і інтэрнацыянальнага братэрства народаў. Газета атрымлівае назву «Трыбуна народаў», часткова запазычаную ад органа французскага рэволюцыянера Бабефа, што выдаваўся ў 1795 годзе. Супрацоўнікамі Міцкевіча былі рэволюцыянеры розных нацый: французы, палякі, рускія, іспанцы і іншыя.

Міцкевіч публічна і дэманстрацыйна абвяшчае аб сваім соцыялізме. Міцкевічаўскі соцыялізм быў мешанінай рэлігійнага елею і прывязанасці да Напалеона з глыбокім рэволюцыйным дэмакратызмам. Міцкевіч стараўся давесці, што ідэя Напалеона — гэта сапраўдны дэмакратызм. Як паслядоўнік так зразумелага банапартызма, ён прагне пагадзіць соцыялістаў з Напалеонам. Сярод членаў рэдакцыі «Трыбуны народаў» банапартызм Міцкевіча не знайшоў спачування. Аляксандр Герцэн расказвае, што на банкеце з прычыны гадавіны лютаўскай рэволюцыі следам за Міцкевічам выступіў іспанец Сагра з пратэстам супроць яго пераконанняў.

Рэлігійныя ідэі Міцкевіча, як і яго банапартызм, цалкам зразумелы. Яго соцыялізм вырас на глебе дваранскага паўстанцкага радыкалізма і дробнамяшчанскага ўтапічнага соцыялізма, а не з соцыялізма навуковага, пролетарскага.

Хаотычным і невыкрышталізаваным было палітычнае веравызнанне Міцкевіча ва ўступным артыкуле «Трыбуны народаў» — «Наша праграма». З аднаго боку, ён гаворыць: «Як людзі лютаўскай рэволюцыі, салідарызіруемся з Вялікай французскай рэволюцыяй» і рэзка выступае супроць манархістаў і рэакцыянераў, з другога-ж боку, паводле яго — «Вялікая французская рэволюцыя была наследніцай хрысціянства».

У некалькіх дзесятках артыкулаў, змешчаных у 1849 годзе ў «Трыбуне народаў», зазіхацеў выдатны публіцыстычны талент Міцкевіча. З гарачым запалам выступае ён супроць буржуазнай французскай рэспублікі, супроць Гіза і Т'ера, абвінавачваючы іх у здрадзе інтарэсам народа і лозунгам лютаўскай рэволюцыі. «Часовы ўрад, — піша Міцкевіч у адным з артыкулаў, — не зразумеў мыслі, якую народ яму даручыў развіць і ажыццявіць». У іншых артыкулах Міцкевіч выступае ў абарону свабоды друку, грамадскіх таварыстваў і сходаў.



А. Міцкевіч у 1844 годзе. Партрэт работы невядомага мастака.
Фотарэпрадукцыя Е. Халдзея (БелТА).

Міцкевіч не баіцца сілы капітала. «Рэакцыя, якая абапіралася выключна толькі на грошы, якая гаварыла толькі пра грошы, якая дзейнічала толькі грашыма, знойдзе смерць, мы ў гэтым упэўнены, якраз у гэтай грашовай справе»,— гаворыць ён у артыкуле «Мільярд» — «Усюды, у прыватным жыцці, як і ў публічным жыцці, у палітыцы, у грамадскіх адносінах, у сям'і, усюды хітрасць, мана, распешчаная прага да асалоды, самалюбства, абагаўленне свайго «я», — гаворыць ён у другім месцы.

У перадвыбарчым артыкуле «Сяляне» надзвычай трапна, абапіраючыся на гістарычны матэрыял, засцерагае ён французскіх сялян каб яны не верылі, нібыта соцыялісты намагаліся іх экспрапрыіраваць. Толькі разам з рабочым класам, з соцыялістамі на чале, здолеюць сяляне здабыць сабе сапраўдную свабоду і справядлівасць. Авангардам у гэтай барацьбе Міцкевіч лічыць рабочых: «Няхай не забываюць, што беручы зброю за справу цярпення і нястач агульных, яны, не меўшы раней дзе галовы прытуліць, здабылі сабе права на жыццё», — гаворыць Міцкевіч у артыкуле «Рабочыя гарады», падкрэсліваючы, што «лёс рабочых гарадоў залежыць ад саміх рабочых».

Калі італьянцы не адважыліся канфіскаваць скарбы манастыроў і царкоўных сапоўнікаў, Міцкевіч абвінаваціў іх у адсутнасці рашучасці: «Сродкі, якія дзенебудзь рэволюцыянеры адкідаюць, на другі дзень паслужаць рэакцыі для падаўлення свабоды. У рэволюцыі трэба быць рэволюцыянерам. Хто ім не будзе, падзе».

Соцыялізм неразрыўна спалучаецца для Міцкевіча з ідэяй інтэрнацыянальнага братэрства народаў і барацьбы супроць дэспатызма. Поўны высокага энтузіязму, працягвае ён братнюю далонь венграм, якія баранілі сваю рэспубліку супроць войск «жандарма Еўропы» Нікалая I. У выдатнай адозве да венграў ён гаворыць: «Наперад! Яшчэ крок і ўся старая Еўропа захістаецца». Гэта былі словы не паэта-мечтацеля, а рэаліста-палітыка. Так думала, адчувала і марыла ўся тагочасная рэволюцыйная Еўропа, такі матыў гучаў пры нараджэнні найвялікшага твора эпохі — «Маніфеста комуністычнай партыі». Міцкевіч глядзіць на свет не вачыма навуковага соцыяліста, ён не разумее складанага механізма класавай барацьбы, але ён безагаворачна стаіць на баку працоўных класаў.

Перамога рэакцыі і паражэнне рэволюцыйнага руху паслабілі ў Міцкевічу яго «гістарычны аптымізм», тыповы для рэволюцыйных дэмакратаў 40-х і 50-х год.

Міцкевіч далучыўся да рэволюцыі не толькі як дзеяч і палітычны мысліцель, але і як тэарэтык мастацтва. У дасціпным артыкуле «Афяра рэволюцыі» ён разбівае плёткі і паклёпы, нібыта італьянскія рэволюцыянеры пагражалі жыццю вядомага кампазітара Расіні: «Дух рэволюцыйны, — піша ён. — смяротна ўразіў вялікі дух мастацтва. У часе астатніх падзей у Італіі ніхто не быў імі так уражан, так засмучан, як Расіні. Тым часам рэволюцыя крочыла наперад, уторглася ва ўсе тэатры, ва ўсе філарманічныя таварыствы... Ва ўсім гэтым абшырным музычным свеце не было ўжо месца для вясёлага Фігаро».

Здзіўляюць гэтыя трапныя заўвагі вялікага майстра слова, які здолеў асэнсаваць, што рэволюцыя ахоплівае ўсе галіны жыцця, разумовай дзейнасці і мастацтва і ўтаргаецца ў свет гукаў і слоў. Даўнішні байраніст і рамантык з незвычайнай адвагай і праніклівасцю вітае зару новага мастацтва ў Еўропе, хоць гаснучы паэтычны талент не дазволіў яму перакаваць свае пачуцці ў магічныя дзейсныя словы.

Чым-жа быў соцыялізм Міцкевіча? Ці быў ён мінутным захапленнем? Міцкевіч мог сцвярджаць, што «пачуцці рэлігійныя і патрыятычныя з'яўляюцца падставай соцыялізма», але што ён даў сябе ўзняць магутнай хвалі рэволюцыйна-дэмакратычнай плыні 1848—1849 гадоў і што не было гэта выпадковым парывам, а рэзультатам доўгіх і драматычных пераўтварэнняў духоўных, — гэта неаспрэчна. Ён далучыўся да соцыялізма, да рэволюцыі, бо яна паказала яму ва ўсёй паўнаце разлажэнне старога свету, а Міцкевіч прадчуваў яго канчатковае падзенне.

А. Дэгаль

Беларусь у Міцкевіча

Выдатны польскі паэт Міцкевіч, які так магутна выказаў боль і гнеў польскага народа, прыгнечанага царызмам, крыніцу для сваёй творчасці і натхнення знайшоў на Беларусі.

Навагрудак, радзіма вялікага паэта, акружан беларускімі вёскамі. І з гадоў маленства Міцкевіч меў блізкія дачыненні з беларускім народам. Мы не здзіўляемся з гэтага: хоць Міцкевічы і належалі да шляхты, аднак узровень іхняга жыцця не вельмі перавышаў жыццёвыя ўмовы сялян; нагадвалі яны хутчэй тую шляхту з дабржынскага засценка, пра якую Міцкевіч піша ў «Пану Тадэушу».

Была пасуць не ў лапцях з кары,
а ў башмаках,
І збожжа жнуць, і нават прадуць
у рукавічках.

Не было паміж сям'ёй Міцкевіча і беларускім людам той розніцы жыццёвага ўзроўню, якая бывае звычайна неадольнай граніцай. Малады Міцкевіч ахвотна бываў у вёсцы, прыглядаўся да яе жыцця, прыслухоўваўся да яе песняў, да яе скаргаў. Разам са сваім школьным калегам Янам Чачотам, пазнейшым збіральнікам народных беларускіх песень, Міцкевіч ахвотна ўдзельнічаў у вясковых святах, бываў на вяселлях і дажынках, на кірмашах і вечарынках. Назаўсёды запалі ў памяць і ў сэрца народныя песні, мары. Знаходзім мы іх пасля ў яго баладах, у паэме «Дзяды».

У маленстве ўбіраў ён у сябе чароўнасць беларускіх песень, спяваных яму нянькай яго Гансецкай. Над калыскай яго стаяла прыгнечаная польскімі панамі Беларусь, шэпчучы яму свае смутныя і прыгожыя песні аб крыўдзе. Прагнае ўяўленне паэта насычаў потым легендамі і байкамі стары слуга Блажэй.

Маленства Міцкевіча,—а перыяд гэты дае найбольш уражанняў у жыцці,— звязана з Беларуссю і яе народам. І гэта адбілася на фарміраванні псіхікі будучага піонера рамантызма ў Польшчы, будучага рэволюцыйнага дэмакрата.

Свежасць, пластыка і простая мудрасць народных песень пакінулі моцны след у яго творчасці. Праз шмат год Міцкевіч—ужо на эміграцыі—расказваў Аляксандру Ходзьку: «З усіх народаў славянскіх русіны, г. зн. сяляне пінскай губерні, а часткова мінскай і гродненскай, найбольш захавалі славянскага. У іх байках і песнях ёсць усё. Пісаных помнікаў мала, толькі Літоўскі статут напісан іхняй мовай, найгарманічнай і найменш скажонай з усіх дыялектаў славянскіх. Усё жыццё іх у духу. На зямлі прайшлі яны цэлую гісторыю страшных бядот і ўціску. Нават зямля, на якой жывуць, убогая, сухая, бясплодная, пяскі альбо балоты».

Першымі тэмамі вершаў, з якімі выступіў Міцкевіч, як знішчальнік класічных форм паэзіі, былі «Балады і рамансы», напісаныя на народных матывах, з грамадзянскім акцэнтам.

Народнасць гэтых балад — народнасць беларускай вёскі. Тэматыка балад—беларуская народная песня і легенда. Міцкевіч шмат чэрпае з іх. «Свіцязь», «Свіцязянка», «Лілії», «Рыбка»—гэта разгорнутыя песні і паданні беларускія, у якіх так часты матыў народнай крыўды і «жаданай» помсты, якая спатыкае прыгнятальніка. У вершы «Рыбка» злы памешчык ператвараецца ў камень за спакушэнне прыгоннай сялянкі.

Гэты элемент чараўнічасці, як і матыў віны і бязлітаснай кары, выступае ў беларускай песні. Міцкевіч сам прызнае, што матывы для сваіх балад ён узяў з народных песень, якія спяваліся сярод дробнай дворнай шляхты.

Нават слоўнік балад адлюстроўвае моцныя ўплывы сялянскай беларускай гаворкі. Пейзаж, які паказвае Міцкевіч у баладах,—пейзаж беларускі.

Надзвычайную сілу паэтычнага выражэння набыў беларускі фальклор у паэме «Дзяды». У другой частцы Міцкевіч апісвае стражытны сялянскі абрад «дзяды», які бытаваў на Беларусі і ў Літве. Гэта—рэшткі даўняга паганскага абраду. Адбываецца ён у кастрычніку на могілках, дзе выклікаюць духі памёршых, каб яны ўзялі з рук гусляра лекі на свае пакуты на тым свеце. Трэба падкрэсліць, што вобраз гусляра—тыповы беларускі народны вобраз. На яго выклік з'яўляецца дух злога пана, аб здзеках якога з народа расказвае сялянка. Дух пана адыходзіць, не атрымаўшы палёгкі за свае злачынствы. Беларускі селянін у песні вызначае суровую кару лютаму пану,— кару, якая не была яшчэ дасягальнай у рэчаіснасці. Гаворыць тут прыгнечаная беларуская вёска, яе бунт, яе маральны суд. Міцкевіч паніў простую і глыбокую праўду народа, адчуваючы, што ў ёй— суд гісторыі.

Веданне вёскі і любоў да яе дапамаглі Міцкевічу адыйсці ад фальшывага паказу сялян псеўдакласічнымі паэмамі. Пакуты народа далі благароднай і чулай душы Міцкевіча магутны імпульс, які вёў яго потым да барацьбы за свабоду чалавека.

Сам Міцкевіч з гордасцю заўсёды паўтараў, што ён адчувае ў сабе злучаныя карэнні душы польскай і літоўскай, асобныя ўласцівасці гэтых сумежных краёў.

Вялікаму польскаму паэту, аднаму з вялікіх паэтаў славянскіх, беларуская зямля была калыскай і натхненнем. Сёння, калі разам з польскім народам уся Беларусь ушаноўвае памяць Адама Міцкевіча, гэты факт робіць геніяльнага паэта асабліва нам блізкім.



Падрыхтоўка к 85-годдзю з дня смерці Адама Міцкевіча ў Навагрудку. На здымку: Пасяджэнне навагрудскай юбілейнай камісіі. З дакладам выступае дырэктар Дома-музея імя Міцкевіча тав. М. П. Крынскі (справа).

Фота В. Лупейкі (БелТА).

У музеі Адама Міцкевіча

Пасля рэстаўрацыі адкрыўся для наведвальнікаў домік-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку. Працоўныя заходніх абласцей рэспублікі выказваюць вялікую зацікаўленасць да музея. Атрымана шмат заявак на калектыўныя экскурсіі з многіх гарадоў, мястэчак і калгасаў.

У музеі арганізавана фотавыстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці паэта. Выстаўка разбіта на раздзелы: «Міцкевіч у Навагрудку», «Міцкевіч у Віленскім універсітэце», «Міцкевіч настаўнікам у Каунасе», «Творчасць Міцкевіча», «Літаратура аб юнацкім перыядзе паэта», «Міцкевіч—палітзняволены», «Палітычная дзейнасць Міцкевіча», «Сямейная бібліятэка паэта» і «Совецкі друк аб Міцкевічу».

Навагрудскі мастак Грыгорый Альтман зрабіў для выстаўкі партрэт паэта і мастацкую кампазіцыю «Пушкін і Міцкевіч ля помніка Пятру I».

Навуковы супрацоўнік музея В. Ляруй падрыхтаваў да друку кнігу «Гісторыя стварэння музея Міцкевіча ў Навагрудку».

4 лістапада музей Міцкевіча наведалі народны паэт БССР Янка Купала і старшыня рэспубліканскага ўрадавага камітэта па святкаванню 85-годдзя з дня смерці Міцкевіча пісьменнік-ордэнаносец Міхась Лынькоў. Падрабязна азнаёміўшыся з музеем, Янка Купала і Міхась Лынькоў у кнізе водзываў напісалі:

«Прыемнае уражанне зрабіла на нас усё, што мы бачылі ў музеі вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча, слаўнага сына зямлі навагрудскай. Што зроблена—добра. Але багата і багата яшчэ трэба зрабіць, каб дастойна ўшанаваць памяць вялікага паэта, зрабіць гэта месца цэнтрам навуковага вывучэння і даследвання ўсіх крыніц і вытокаў паэзіі слаўнага і вялікага сына польскага народа. Шчыра ўпэўнены ў тым, што толькі цяпер, на вольнай навагрудскай зямлі, справа музея набудзе сапраўдны размах, і кожны чытач Міцкевіча—паляк, беларус, рускі, яўрэй будуць мець магчымасць у самым недалёкім будучым пазнаёміцца ў музеі з багатымі і разнастайнымі матэрыяламі аб жыцці і творчай дзейнасці любімага паэта».

Раённы камітэт КП(б)Б арганізаваў сустрэчу пісьменнікаў з настаўнікамі горада, на якой абмеркаван ход падрыхтоўкі да святкавання 85-й гадавіны з дня смерці А. Міцкевіча.

У дзень гадавіны ў Навагрудак для ўдзелу ў міцкевічаўскіх святах прыедуць беларускія, рускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі. Рыхтуецца вялікі літаратурны вечар прысвечаны паэту.

В. ЦІМСКІ.

Навагрудак (наш кар.).

Творчыя абмеркаванні ў ССП БССР

19 лістапада на адкрытым партыйным сходзе паэтэса Эдзі Агняцвет чытала свае новыя вершы «На беразе Волгі», прысвечаныя Чкалаву. У абмеркаванні вершаў прынялі ўдзел тт. Г. Бярозкін, Танк, К. Крапіва, Х. Мальцінскі, З. Цялесін, А. Куляшоў, П. Броўка, Зм. Бядуля і М. Лынькоў. Усе выступаўшыя адзначылі, што ў сваіх новых вершах Э. Агняцвет вырасла ў фармальных адносінах, у сэнсе валодання рытмам, радком, страфой. Аднак, пастаўленую задачу — стварыць паэтычны характар Чкалава альбо, ва ўсякім выпадку, запечатлець асобныя рысы жывога чкалаўскага характару паэтэсе не ўдалося. Гэтаму перашкодзіў памылкова выбраны ёю жанр стылізацыі пад казку. Чкалаў у вершах Агняцвет — не жывы чалавек, а застылая алегорыя, умоўны знак.

***

21 кастрычніка на пасяджанні праўлення ССП БССР абмяркоўваўся раман М. Пасляловіча «Паўстанне». Выступаўшыя ў спрэчках тт. Я. Шарахоўскі, А. Кучар, М. Модэль, П. Кавалёў, Г. Бярозкін, Б. Чорны, К. Крапіва, Р. Мурашка і М. Лынькоў адзначылі, што раман «Паўстанне» знамянуе сабою значны творчы рост М. Пасляловіча. Выступаўшыя прыводзілі рад удалых месц, эпізодаў, вобразаў рамана. Адначасна былі зроблены істотныя заўвагі з повада рамана, у якім няма глыбокай мыслі, дэталёва распрацаваных чалавечых характараў.

А. К.

К. Ансельм

Міцкевіч без бронзавага забрала

Польская рэакцыя вельмі добра разумела, якое месца займае ў сэрцах і думах польскіх народных мас Адам Міцкевіч. Яна добра ведала, што на творчасці гэтага паэта ўзгадоўваліся цэлыя пакаленні. Таму, не ўтойваючы яго творчасці, яна тэндэнцыйна выбірала з яе і папулярызі-



«Юбілейная памятка: **Адам Міцкевіч. Паэзія**» — збор твораў А. Міцкевіча на польскай мове ў томіку памерам 2×3 сантыметры; выдадзены ў 1898 годзе ў Варшаве к 100-годдзю з дня нараджэння паэта. Кніга, у якой каля 700 старонак, заключана ў металічны футляр-брэлок з павелічальным шклом для чытання тэкста. Яна была выпушчана ў абмежаванай колькасці экземпляраў і зараз з'яўляецца выключнай бібліяграфічнай рэдкасцю.

Фота І. Каплінскага.

равала тыя моманты, якія маглі паслужыць рэакцыі і клерыкалізму.

Вершы Міцкевіча можна было знайсці ў кожнай школьнай чытанцы, у кожным календары, у кожным папулярным выданні. Але падбіраліся яны з дапамогай спецыяльнага ключа. Школьныя падручнікі шмат месца прысвячалі аналізу творчасці Міцкевіча. Падручнік Манфрэда Крэдля разглядаў відзенне ксяндза Пятра з III часткі «Дзядоў», ролю Польшчы, як «Хрыста народаў», але замоўчваў драждлівыя моманты з перыяду так-званага «товіянізма», не вельмі многа гаварыў аб парыжскай публіцыстычнай дзейнасці Міцкевіча і перадсмяротных зрывах вялікага паэта і рэволюцыянера.

Фіміям кадзільніц урадавага ўшанавання засланіў сапраўднае аблічча паэта. Былі паўныя рэчы, аб якіх усе ведалі, але аб якіх «не выпадала гаварыць». Сярод універсітэцкіх прафесараў паявіўся цэлы клан «вучоных», якія свядома, з цынічным дастоінствам скажалі, дэфарміравалі сапраўднае аблічча Адама Міцкевіча. З постаці Міцкевіча здзіралі ўсё чалавечае, што не адпавядала стандартнай, этыкетнай ацэнцы «ўзнёслага прарока народа» і выклікала глыбокую любоў да Міцкевіча, як да жывога і чулага чалавека. У Міцкевіча былі зрывы, мінуты ўпадку. Не раз ён памыляўся. Хіба быў ён праз гэта менш славуты?

Буржуазная крытыка заключала творчасць Міцкевіча ў рамкі больш-менш адзінай і аднолькавай традыцыі штампу: Міцкевіч з часоў юнацтва, калі браў удзел у саюзах філарэтаў і філаматаў, гэта — «айчына, навука, дабрадзейнасць». Міцкевіч перыяду «дзядоў віленскіх», гэта— «рамантычная любоў няшчаснага самазабойцы»; Міцкевіч у Расіі — «пакутнік і трагічны выгнаннік»; Міцкевіч у Парыжы — «ўзнёслы містыцызм».

Першым пачаў характарызаваць аблічча паэта яго сын Владыслаў, які спаліў частку «працэнзураваных» ім дзённікаў бацькі. Тэндэнцыі Владыслава Міцкевіча супадалі з афіцыйнай крытыкай. Пачынаючы ад універсітэцкага прафесара і канчаючы настаўнікам малодшых класаў— усе згоднымі намаганнямі імкнуліся да адной мэты: да стварэння з Міцкевіча «ўзора для наследвання», «маралізуючай постаці», якую, як у другім выпадку сказаў малады раманіст Гамбровіч, належала «любіць і мілаваць, бо пракорам быў». Паводле сцверджанняў усіх гэтых катаў вялікай міцкевічаўскай спадчыны — паэт не мог памыляцца, грашыць, не мог упадаць ва ўнутраныя сумненні, ніколі не мог быць на раздарожжы. Ён мусіў быць аднастайна благародны, узвышана нудны, манументальна вялікі і — мёртвы. Перад скасцянелым, застылым у нерухомасці манументам пахавальныя факельшчыкі польскай літаратурнай крытыкі з нуднымі мінамі складалі прадпісаную рытуалам колькасць паклонаў.

Супроць гэтай вульгарызацыі творчасці і жывой постаці вялікага польскага паэта выступіў з вострай крытыкай выдатны знатак Міцкевіча — Тадэуш Бой-Жэленскі. «Бранзіроўшчыкі» Боя-Жэленскага былі адной з самых папулярных кніжак аб Міцкевічу. Ён патрабаваў ад грамадства і ад урадавай крытыкі, каб яны, нарэшце, пакончылі з бронзавым манументам «прарока», а ўзяліся за добрасумленны аналіз творчасці Міцкевіча — чалавека.

Выразная супярэчнасць паміж Міцкевічам — манументам і Міцкевічам — жывым чалавекам выступае ва ўсіх перыядах яго жыцця і творчасці.

Характэрна супярэчнасць рэчаіснасці з прэпарыраванай легендай аб тым перыядзе, калі пасля працэса віленскай моладзі Міцкевіч вымушан быў пакінуць Літву і выехаць у глыб Расіі. Паводле Боя-Жэленскага, гэта быў адзін з самых шчаслівых момантаў у жыцці Міцкевіча. «Трагічная любоў» да апетай у «Дзядах» Марыі Верашчака крыху апрыкрала і не магла паглынуць усіх яго сіл і энергіі. Маладога і амбітнага паэта пачала цяга́ціць роля «рамантычнага каханка». Маральна-выхаваўчая праца анемічных гурткоў універсітэцкай моладзі, з якімі супрацоўнічаў Міцкевіч, мала мела агульнага з сапраўднай шырокай рэволюцыйнай плынню. Што чакала-б паэта на Віленшчыне? Настаўніцкая работа ў адным з павятовых гарадоў? Перажоўванне любоўных прыгод? Абшчэнне з прастадушнымі калегамі, за якіх ён быў вышэй на цэлую галаву?

Працэс філарэтаў, німб геройства, выезд у далёкі край, дзе яго віталі як новага таленавітага паэта-рэволюцыянера, падарожжы, знаёмства з найвялікшымі тагочаснымі майстрамі пяра, сяброўства з Пушкіным! Усё гэта зрабіла спрыяючы ўплыў на творчасць маладога Міцкевіча. Не след адмаўляць яго сапраўднага, шчырага і глыбокага суму па роднай зямлі. Глыбокім і ўзрушаючым смуткам авеяны яго «Крымскія санеты». Санет «Акерманскія стэпы» паэт заканчвае глухім акордам роспачы:

Спынімся — Як ціха! — Жураўоў лёт
чую,
Якіх-бы нават быстры сокал не угледзіў;
І як матыль калыша траву стэпавую,
І як вуж па зямлі слізгаецца недзе,
У гэткай цішыні так чутка ўсё лаўлю я,
Што чуў-бы з Літвы голас. — Ніхто не
кліча, едзем!
(Пераклад М. Танка).

Не былі гэта, аднак, выключныя перажыванні.

«Перад ад'ездам, — піша Міцкевіч аб сваім выездзе з Масквы, — літаратары наладзілі мне адвітальны вечар (не раз мне рабілі падобныя сюрпрызы). Былі вершы і спевы, падаравалі мне на памяць срэбны бакал з подпісамі прысутнічаўшых. Развіталіся са мною са слязамі». (Паводле М. Крынскага «Міцкевіч у Расіі»).

Сардэчны прыём з боку рускай прагрэсіўнай інтэлігенцыі, пашана, прызнанне і братняя прыязнь найвыдатных прадстаўнікоў рускай рэволюцыйнай мыслі зрабілі незабыўны ўплыў на творчасць Міцкевіча. Паэт трапіў у вадаварот сапраўднай працы і першы раз з часоў «Оды да маладосці» шырока развінуў да палёту сакаліныя крыллі.

Такіх перыядаў у творчасці Міцкевіча знойдзем шмат. Мала ўдзялялася ўвагі ў польскай афіцыяльнай крытыцы прычынам, па якіх Міцкевіч не ўдзельнічаў у лістападаўскім паўстанні, хоць сам быў адным з натхніцеляў і правадыроў паўстання 1830 года. Замест непераканаўчых «даследванняў» і «апраўданняў» Бой-Жэленскі аналізіруе трагедыю вялікага паэта, які ў напісанай у эміграцыі III частцы «Дзядоў», пад уплывам пякучага болю і ўразлівых дакораў сумлення, «адным прыжком адолеў дзяліўшую яго ад народа бездань». Гэты вялікі боль, які нарадзіў «вялікую імправізацыю», закрэсліў памылкі паэта, даўшы яму маральнае права гаварыць ад імя ўсяго церпячага народа:

Я і айчына — адно!

Называюся «мільён» — бо за мільёны
Люблю і цярплю катаванні.

Найбольш, аднак, не адпавядаў сапраўднасці прадстаўлены шавіністычнай і мяшчанскай крытыкай перыяд так-званага «товіянізма».

Пра «товіянізм» і яго творца Товіянскага, які меў такі фатальны ўплыў на асабістае жыццё і на творчасць Адама Міцкевіча, гаварылася найчасцей як пра перыяд узнёслага містыцызма, набліжэння да бога, узрушаючага і трагічнага сузірання.

Агідны сілуэт Товіянскага, гэтага прататыпа Грышкі Распуціна, як злая здань вісеў над жыццём няшчаснага паэта. Нейкія таямнічыя «набажэнствы» з малітвамі за душы памёршых цароў, нейкая плеяда падазроных «братоў» і «сёстраў», скоўванне паэтычнай творчасці—усё гэта глушыла талент Міцкевіча. Нявольнічая залежнасць рэволюцыйнага паэта ад дэгенератыўнага «містыка», былага на ўтрыманні царскага двара, — гэта найбольш змрочны перыяд у жыцці аўтара «Оды да маладосці». Сум па айчыне, блуканні па «парыжскім бруку», трагічная стрэча з «сястрой» Ксаверыяй Дэйбель, даверанай Товіянскага, якая разбіла сямейнае жыццё паэта, нарэшце, псіхічная хвароба жонкі — сплятаюцца ў нейкім кашмары, уцягваючы паэта ў вір і да сёння не высветленай інтрыгі. Перыяд ачмурэння «товіянізмам» пачаўся ў 1841 годзе і трываў на працягу некалькіх доўгіх беспамятных год.

Разрывам Міцкевіча з «братам» Андрэем Товіянскім, гэтым «разумным мужам», якога паслаў сам гаспод бог, каб яго прарочымі вуснамі перасцерагчы землякоў ад «згубнага ўплыву» усялякіх вольнадумных і вызваленчых тэндэнцый, — пачынаецца ў жыцці паэта перыяд адраджэння.

Інакш на гэты момант глядзела афіцыйная крытыка: «товіянізм» — гэта-ж «далейшая эвалюцыя» рэлігійных поглядаў Міцкевіча. А невыгодныя для яе моманты крытыка старалася замоўчваць.

Тое самае рабілася з паходжаннем Міцкевіча: рэлігійная і нацыяналістычная крытыка ніколі не ўспамінала аб дамешцы яўрэйскай крыві, якую Міцкевіч атрымаў ад сваёй маткі, франкісткі.

Не ўспаміналі і пра загадкавыя акалічнасці, у якіх загінуў Міцкевіч, паехаўшы ў Італію для арганізацыі польскага легіёна. Відаць, правае крыло польскай эміграцыі ніяк не магло пагадзіцца з арганізацыяй паэтам яўрэйскага легіёна.

Міцкевіча напаткаў досыць часты лёс змагароў за ідэю. Паэту збудаваны помнікі. Але пад цяжкім цоколем помнікаў была пахавана жывая ідэя.

Перад новым пакаленнем совецкіх паніцеляў творчасці Адама Міцкевіча стаіць удзячная задача. Ва ўмовах свабоды навуковых даследванняў, совецкім крытыкам трэба сарваць з твару паэта бронзавае забрала і паказаць нам аблічча жывога творца, каб з-пад залатой «рызы» польскага ўрадавага культу не выглядваў мёртвы твар набальзаміраванай нуды, каб паэт жыў разам з намі і запаліў агнём свайго чалавечага сэрца, як палаючы на ветры факел.



Усебеларуская мастацкая выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары БССР». Карціна мастака Н. Пашкевіча «У партызанскі атрад». Фотарэпрадукцыя І. Калінінскага.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ФОРМА Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ

★
А. Далін
★

З усіх пытанняў, якія ўзнікаюць перад намі пры аглядзе адкрыўшайся ў Мінску мастацкай выстаўкі, трэба асабліва вылучыць пытанне аб нацыянальнай форме ў беларускім выяўленчым мастацтве. Гэта тым больш неабходна, паколькі многія беларускія мастакі не ўдзяляюць патрэбнай увагі распрацоўцы нацыянальнай формы.

Гістарычны лёс і культура рускага і беларускага народаў цесна пераплятаюцца: беларуская культура заўсёды была пад уплывам магутнай братняй рускай культуры. Не дзіўна таму, што і сёння мастакі Савецкай Беларусі вучацца і растуць, перш за ўсё, на традыцыях мастацтва вялікага рускага народа. Само пытанне аб нацыянальнай форме ў беларускім мастацтве непарыўна звязана з ростам і развіццём гэтага мастацтва. Пралетарская рэвалюцыя і наша сацыялістычная дзяржаўнасць усямерна спрые развіццю нацыянальнага па форме і сацыялістычнага па свайму зместу мастацтва.

Як-жа разумець нацыянальную форму ў мастацтве? Само сабою зразумела, што форму нельга выдумаць, паколькі само разуменне нацыянальнага ў работах мастака непарыўна звязана з прыродай яго пачуццёвых вобразаў, абумоўленых матэрыяльнай і духоўнай практыкай яго народа. Вывучаючы і назіраючы жыццё свайго народа, разам з ім змагаючыся за лепшую будучыню, пранікаючыся дыханнем вятроў, хараством лясоў, палёў і рэк роднай прыроды, мастак мысліць пачуццёвымі вобразамі роднай зямлі, якія арганічна выліваюцца ў формы нацыянальныя.

Але, скажуць нам, ці не прывядзе гэта мастака да нацыянальнай замкнутасці ў мастацтве, як гэта можна прасачыць на творчасці некаторых перадвіжнікаў, у прыватнасці В. Перова, і ў больш позні час у Беларусі—на творчасці Ю. Пэна? Не прывядзе. Нацыянальная замкнутасць В. Перова і Ю. Пэна тлумачыцца некаторай сацыяльнай вузкасцю іх светапогляду: яны не здолелі падняцца ў сваёй творчасці да асэнсавання альбо адчування агульначалавечых гуманістычных ідэалаў, як гэта здолелі зрабіць вялікія мастакі свету Рэмбрандт, Рэпін і Сурыкаў. Застаючыся нацыянальнымі, гэтыя мастакі, апяваючы ў сваіх карцінах агульначалавечыя ідэалы гуманізма, перамаглі нацыянальную абмежаванасць і таму мы ўспрымаем іх творчасць, як у пэўнай меры творчасць інтэрнацыянальную. «Блудны сын» па сваёй ідэі—твор інтэрнацыянальны, але для кожнага ясна, што карціна гэта напісана ў стылі галандскай школы XVII стагоддзя, тварцом якой быў Рэмбрандт. Што датычыць Сурыкава, то створаныя ім шэдэўры сусветнага жывапісу—«Баярыня Марозава» і «Меншыкаў у Бярозаве», будучы агульначалавечымі па свайму зместу з'яўляюцца ў той-жа час творамі чыста-рускага духу.

Значыць, савецкі мастак, мастак новага свету, застаючыся мастаком нацыянальным, у той-жа час можа і павінен быць у сваёй творчасці і мастаком глыбока інтэрнацыянальным, паколькі яго пачуццёвае ўспрыняцце свету базіруецца на камуністычным светапоглядзе. Нацыянальнае ў мастацтве не выключае інтэрнацыянальнага яшчэ і таму, што развіццё сацыялістычнага мастацтва мысліцца намі толькі на базе праемственасці і асваення ўсяго лепшага, што створана сусветным мастацтвам.

Але, дазвольце, — могуць запытацца ў нас, — навошта развіваць нацыянальнае мастацтва, калі ў надыходзячым камуністычным грамадстве — з прычыны роўнасці нацыянальнасцей, іх ідэйнага адзінства і адзінства сацыяльна-эканамічных фактараў—відавочна, знікне і такое паняцце, як нацыянальнасць, а само мастацтва выльецца ва ўсеабдымныя, бясконца разнастайныя формы прыгожага, арганічна аб'яднаўшы ў сабе ўсё лепшае, што было створана дасюль народамі ўсяго свету. На гэта мы адкажам вычарпальнымі словамі таварыша Сталіна: «Трэба даць нацыянальным культурам развіцца і разгарнуцца, выявіўшы ўсе свае патэнцыі, каб стварыць умовы для зліцця іх у адну агульную культуру з адной агульнай мовай». («Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне», стар. 195). Гэта азначае, што ў існуючых умовах пакольк нацыянальнасці ў нашай краіне існуюць, а сацыялістычная дзяржава наша знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні сама развіццё мастацтва савецкага народа павінна ажыццяўляцца праз развіццё мастацтва нацыянальнасцей, паколькі па прыродзе сваёй нацыянальная форма з'яўляецца для любой нацыі найбольш блізкай, зразумелай і дастаткова вычэрпваючай формай мастацкага адлюстравання рэчаіснасці. Важна толькі, каб гэта нацыянальная форма знаходзілася ў арганічным адзінстве з яе інтэрнацыянальным сацыялістычным зместам.

Гаворачы аб нацыянальнай форме ў творчасці беларускіх мастакоў, спынімся перш за ўсё на работах Н. Пашкевіча. Нам думаецца, што гэты таленавіты мастак, які вырас з гушчы свайго народа, на прасторах беларускай зямлі, сур'ёзна падыходзіць да разумення нацыянальнай формы ў выяўленчым мастацтве. Разбяром яе адзнакі.

Першае—нацыянальны тыпаж, характар. Як вядома, тыповыя рысы ў беларускага народа выражаны ярка. Гэта моцны і гераічны па характару народ, які здолеў пранесці праз вякі, праз войны, голад і холад, праз вогнішчы паўстанняў сваю мову, сваю культуру. У гэтай цяжкай барацьбе народ не мог не палюбіць сваю зямлю, палітую ягоным потам і крывёю. Жыццёсцвярджаючы аптымізм народа асабліва ярка праяўляецца ў цудоўных па каларыту нацыянальных танцах і песнях Беларусі. І, нарэшце, сам воблік беларуса, бадай, настолькі-ж характэрны, як характэрны вобразы рускіх людзей.

Заўважыць нацыянальны тыпаж мастак здолее толькі пры той умове, калі ён будзе ўважліва вывучаць быт і характар свайго народа, пісаць з натуры, прыкмячаючы ў рухах, у твары характэрныя для беларуса рысы, вывучаючы адбываючыяся ў духоўным обліку і самых рысах твару змяненні, выкліканыя пераменамі ў матэрыяльным і духоўным жыцці народа. Успомнім, як шмат працавалі над партрэтнай характарыстыкай рускіх людзей Рэпін і Сурыкаў.

Следуючы вопыту вялікіх рускіх мастакоў, Н. Пашкевіч імкнецца паказаць у сваіх карцінах вобразы яму блізкія, прачутыя і вывучаныя ў натуры. Першым такім сур'ёзным вопытам мастака з'явілася яго карціна «Сустрэча беларускіх партызанаў з таварышам Сталіным у штабе Заходняга фронта». Па-першае, самой карціне мастак здолеў надаць эпічны народны характар. У вобразе партызанаў-беларусаў мы бачым як-бы народных багатыроў, якія падняліся на барацьбу з інтэрвентамі. Вы глядзіце на пярэдняга з іх, партызана-багатыра, які, зняўшы шапку, у дубленым кажуху з паходнай сялянскай сумкай за плячыма, стаіць перад Сталіным, сваёй магутнай фігурай нібы ўвасабляючы сілу народную. І вы верыце, што гэта селянін-беларус, бо мастаку ўдалося заўважыць у гэтым вобразе партызана нацыянальнае і тыповае.

Яшчэ больш сур'ёзным вопытам нацыянальнай формы з'яўляецца карціна Н. Пашкевіча «У партызанскі атрад». Тут шмат нацыянальнага, тыповага, пачынаючы з бытавой абстаноўкі сялянскай хаты і канчаючы дзеючымі асобамі. У цэнтры кампазіцыі—селянін-беларус. Сабраўшыся ў партызанскі атрад, ён развітваецца з сынам. Асцярожна падняўшы дзіця з калыскі, ён па-бацькоўску пяшчотна цалуе яго. Хто ведае, магчыма, гэта апошняе развітанне? Вы глядзіце на моцныя рукі партызана, якія так пяшчотна трымаюць дзіця, на яго самога, праніклутага рашучасцю барацьбы з белапольскімі захватчыкамі і сумам развітання з сям'ёй, і пазнаеце ў вобразе гэтага партызана глыбока чалавечны вобраз селяніна-беларуса, які любіць сваю радзіму і гатоў на ўсе ахвяры ў яе імя.

З вялікай сілай перададзен мастаком і вобраз жонкі партызана. Адбітак суровага жыцця ляжыць на ўсім яе обліку, у яе душы яшчэ бытуюць прадрассудкі мінулага, якія адчуваюцца намі і па мільганню лампады перад абразом, што віднеецца ў правым куту карціны, на трэцім плане яе. Жанчына стаіць паміж гэтай лампадай і калыскай дзіцяці. Стаіць паміж мінулым і будучым нібы прыкаваная к месцу трывожнымі думамі і пякарам развітання з мужам, але ў ёй ужо абуджаецца ўсведамленне той-жа рашучасці, што кліча яе мужа ў партызанскі атрад.

Вытокі нацыянальнага ў мастацтве вядома, трэба шукаць у самім народзе, у прыватнасці, у яго мастацкай творчасці. Мастаку трэба толькі памятаць, што само гэта народнае дваіста па сваёй прыродзе: побач з элементамі прагрэсіўнымі народнасць мае ў сабе і прадрассудкі мінулага. Значыць, вывучаючы народ і яго творчасць, мастак павінен браць тое, што з'яўляецца жыццёсцвярджаючым для народа і мастацтва. Аналізіруючы новую карціну Н. Пашкевіча, можна з поўным правам сказаць, што Пашкевіч правільна разумее гэту дыялектычную ўзаемасувязь паміж народам і мастацтвам. Створаныя ім вобразы беларуса-партызана і жонкі партызана — глыбока праўдзівыя вобразы, якія ўвасабляюць у сабе жыццёсцвярджаючую волю і дзярзанне беларускага народа ў барацьбе за сваё шчасце.

Гэтаму ўспрыняццю нацыянальнага ў карціне Пашкевіча, апрача нацыянальнага тыпажу, у значнай меры спрыяюць і тыповыя нацыянальна-бытавыя акалічнасці. Мы бачым на карціне беларускую хату з печчу ў левым куце, з калыскай, выдаўбанай з кавалка дрэва, падвешанай на жэрдку пад столлю. Драўляная бочка, самадзельны, зроблены з дошчак ложак. Такія беларускія хаты тыповы для старой беларускай вёскі.

Характар беларускай хаты ў пэўнай меры абумовіў і карычневаты каларыт карціны. Паказальна, што ўласцівы работам Пашкевіча лірызм моцна адчуваецца і ў гэтай карціне. Суровая тэма тут пададзена мастаком з вялікім тэмпераментам і філасофскім раздум'ем.

Жывапіснае гучанне карціны, яе каларыт бясспрэчна з'яўляецца адным з фактараў нацыянальнай формы ў мастацтве. Самы гэты каларыт узнікае пад кісцю мастака, як яго адчуванні і абумоўлен ён зместам карціны. Новая работа Н. Пашкевіча па свайму каларыту, на наш погляд, твор больш закончаны, чым карціна «Сустрэча беларускіх партызанаў з таварышам Сталіным у штабе Заходняга фронта». Самы зварот мастака да нацыянальнага тыпажу і тыповых бытавых акалічнасцей дапамог мастаку знайсці для сваёй новай работы адпаведны каларыт.

Некаторыя папракаюць Пашкевіча ў тым, што ў яго новай карціне недастаткова выяўлена галоўнае. Гэта ў пэўнай меры правільна. Хочацца бачыць партызана больш вылучаным на карціне ў якасці цэнтральнага вобраза, у Пашкевіча-ж гэты вобраз некалькі аслаблен па жывапісу, некалькі зліваецца з карычневатым фонам сцяны і бытавых дэталей. Праўда, мастак адчуваў гэту небяспеку і таму з левага боку даў светла-шэры фон печы для адцянення фігуры партызана. Але гэтага, здаецца, недастаткова.

Мы не згодны з тымі таварышамі, якія папракаюць Пашкевіча ў захапленні бытавымі дэталямі. Вопыт многіх вялікіх мастакоў вучыць, што дэталь не перашкаджае, а дапамагае, калі ў карціне знойдзена галоўнае — глыбокія, хвалюючыя вобразы жывых людзей.

Такім чынам, нацыянальная форма не ёсць знешні атрыбут, з якім мы сустракаемся ў многіх работах беларускіх мастакоў, падмяняючых нацыянальную форму бытавой дэталлю: беларускім арнаментам і нацыянальным касцюмам. Пярвейшая задача мастака — стварыць тыпаж, характар, дадзены ў тыповых акалічнасцях. Да ліку такіх тыповых акалічнасцей адносіцца і сама прырода Беларусі — яе ландшафт, фарбы яе пейзажу. Успомнім хоць-бы, з якім майстэрствам паказвалі рускую прыроду І. Левітан і А. Васнецоў. У галіне беларускага пейзажу найбольш плодатворна працуюць мастакі Г. Дакальская, Н. Дучыц і В. Будрэвіч.

Застаецца пажадаць, каб нашы мастакі глыбей акунуліся ў жыццё народа, як мага больш пісалі з натуры, у полі і на заводзе, наглядаючы жыццё свайго народа, каб яны больш працавалі над партрэтам, вывучаючы чалавечы твар ва ўсіх найдрабнейшых яго дэталях, не баючыся таго, што яны тым самым нібы ўпадуць у натуралізм. Трэба, нарэшце, зразумець, што ў гады панавання фармалізма многія нашы мастакі страцілі густ да натуры, развучыліся бачыць натуру. Гэта самае цяжкае паслядства фармалізма. Толькі абапіраючыся на глыбокае веданне жыцця, мастак здолее стварыць хвалюючыя нацыянальныя мастацкія вобразы, такія-ж цудоўныя як цудоўна ў сваім творчым дзярзанні сама наша сацыялістычная эпоха.

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ БССР

IV ДЭКАДА СОВЕЦКАЙ МУЗЫКІ

★
Б. Смольскі
★

16 лістапада больш чым у 100 гарадах Совецкага Саюза пачалася IV дэкада совецкай музыкі і эстрады. У БССР дэкада будзе праходзіць з 5 па 15 снежня (з прычыны рамонту канцэртнай залы).

Новая дэкада яшчэ раз прадэманструе велізарные поспехі совецкай опернай, сімфанічнай, камернай і песеннай культуры, ідэйную глыбіню і няўхільны рост майстэрства нашых кампазітараў і выканаўцаў.

Упершыню ў гісторыі музычнага мастацтва праводзяцца такія велізарныя па ахопу грамадскія агляды, аб якіх не ведае ні адна эпоха. Толькі ў эпоху Сталінскай Канстытуцыі магчымы такія ўсенародныя агляды, якія становяцца выдатным фактарам сацыялістычнай культуры і арганічнай часткай нашага музычнага жыцця.

Праведзеныя ў мінулыя годы дэкады совецкай музыкі канстатыравалі велізарны рост зацікаўленасці шырокай аўдыторыі да твораў совецкіх кампазітараў, асабліва да твораў буйнай манументальнай формы — араторый, сімфоній і буйнага канцэртнага стылю (фортэп'янны і скрыпічны канцэрты).

Побач са старымі майстрамі (Мяскоўскі, Пракоф'еў, Шапорын) на дэкадах совецкай музыкі атрымалі высокую ацэнку маладыя таленавітыя кампазітары — Шастаковіч, Хачатур'ян, Коваль, Вано Мурадзелі і інш.

Сярод прайшоўшых дэкад найбольшае значэнне мела 3-я, якая знаменавала сабою нараджэнне совецкага аратарыяльнага стылю. На канцэртах гэтай дэкады выконваліся тры выдатныя творы аратарыяльнага тыпу: сімфонія-кантата Е. Шапорына «На полі Куліковым» (тэкст па А. Блоку), кантата С. Пракоф'ева «Аляксандр Неўскі» (тэкст В. Лугаўскога) і араторыя М. Коваля «Емельян Пугачоў» (тэкст В. Каменскага). Усе тры творы прысвечаны адной тэматыцы — раскрыццю гераічных эпізодаў рускай гісторыі, поўных вызваленчай барацьбы вялікага рускага народа.

Побач з гэтымі манументальнымі творамі і выдатнай кантатай Хачатур'яна аб Сталіне совецкія кампазітары паказалі велізарныя дасягненні ў галіне стварэння совецкага сімфанічнага стылю. Былі выкананы 5-я і 6-я сімфоніі Д. Шастаковіча, сімфонія В. Мурадзелі, прысвечаная памяці незабыўнага С. М. Кірава, сімфонія Кабалеўскага і інш. Яркае ўражанне пакінулі фортэп'янны канцэрт Хачатур'яна і скрыпічны — Мяскоўскага.

Дэкады совецкай музыкі маюць яшчэ тое асаблівае значэнне, што на іх канцэртах шырокая аудыторыя знаёміцца з творамі кампазітараў брацкіх рэспублік. На 3-й дэкадзе совецкай музыкі быў канстатыраван упаўнены рост нацыянальнай сімфанічнай і камернай музычнай культуры. На старонках «Праўды» і іншых газет былі адзначаны і творы беларускіх кампазітараў, у прыватнасці — таленавітая сімфанічная фантазія кампазітара Н. І. Аладава «Пра пагранічніка Лагоду», якая выконвалася ў Маскве.

IV дэкада совецкай музыкі не зусім звычайная, яна ўключае ў сябе яшчэ эстраднае мастацтва. Агульнавядома папулярнасць эстрады ў нашай краіне, любоў да эстраднага мастацтва, якое з'яўляецца масавым і арганічна звязана са штодзённым жыццём. Эстрада пачала адыгрываць вялікую ролю ў нашым грамадскім жыцці. «Праўда» пісала: «Куды толькі не забіраюцца артысты! У кубрыкі баявых караблёў і на трасу ферганскага канала, у калгасы Паміра і на зімоўкі Арктыкі, у школы і на перадавыя пазіцыі франтоў».

Цяперашняя дэкада совецкай музыкі ў Беларусі будзе праходзіць у перыяд нябачанага росквіту беларускай нацыянальнай оперы і балета, сімфоніі і канцэрта, раманса і песні.

За перыяд, які аддзяляе трэцюю дэкаду ад чацвертай, кампазітары Беларусі стварылі рад новых выдатных твораў, з якіх некаторыя неаднаразова выконваліся ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве і іншых гарадах. Гэта — кантата аб Сталіне Залатарова, паэма аб Сталіне Шчэглова, опера Падкавырава «Як гартавалася сталь» (у клавіры), уверцюры Аладава, Цікоцкага, сімфанічная паэма і скрыпічны канцэрт Столава, сімфонія Цікоцкага, фортэп'янны канцэрт Клумава і рад іншых твораў. Усе яны дэманстрыруюць велізарныя поспехі, высокую ідэйную сілу і майстэрства беларускіх кампазітараў.

Канцэрты IV дэкады совецкай музыкі, якія будуць праходзіць у Мінску, уключаюць рад выдатных твораў розных жанраў, форм і сюжэтаў: сімфоніі, кантаты, паэмы, творы канцэртнага і камернага стылю, сюіты з балетаў і лепшыя ўзоры эстраднага мастацтва. У дэкадзе будзе прадстаўлена творчасць беларускіх кампазітараў — Залатарова, Шчэглова, Столава і Клумава, маскоўскіх і ленінградскіх — Шастаковіча, Хачатур'яна, Кабалеўскага і Мурадзелі, а таксама украінскіх — Гозенпуда, Майбарады і Таранава.

З твораў, якія будуць выкананы па нашай дэкадзе, неабходна адзначыць толькі-што напісаную праф. Залатаровым кантату аб Сталіне на тэкст «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну» і паэму аб Сталіне Шчэглова на тыя-ж словы. Апошні твор з вялікім поспехам выконваўся ў Маскве на дэкадзе беларускага мастацтва і атрымаў высокую ацэнку.

Трэба адзначыць таленавітую сімфонію Мурадзелі, прысвечаную С. М. Кіраву, якая з вялікім поспехам выконвалася на 2-й дэкадзе совецкай музыкі, і 6-ю сімфонію Шастаковіча, упершыню выкананую на 3-й дэкадзе ў Маскве пад кіраваннем выдатнага дырыжора Е. Мравінскага. Гэта сімфонія зрабілася прадметам гарачых спрэчак. Аб ёй выказваліся самыя розныя, часам рэзка процілеглыя думкі. Сімфонія на многіх зрабіла двайстае ўражанне. Бясспрэчна адно, што гэта таленавітая, віртуозная па майстэрству сімфонія Шастаковіча мае ў сабе шмат цікавага і выдатнага і выклікае жывейшую зацікаўленасць да сябе з боку тых, хто чуў яго 5-ю сімфонію.

Сімфонія украінскага кампазітара Гозенпуда выконвалася ў мінулым годзе ў Маскве і атрымала высокую ацэнку на старонках друку.

Значную цікавасць прадстаўляе выдатная сюіта для аркестра з балета «Шчасце» Хачатур'яна. Гэту сюіту, шырокая аудыторыя Мінска пачуе ўпершыню.

З асаблівай нецярплівасцю чакае мінскі слухач выканання сюіты кампазітара Кабалеўскага з балета «Залатое калоссе» на беларускую тэматыку. Балет гэты ўжо закончан і ў хуткім часе будзе паказан на сцэне Тэатра оперы і балета БССР.

Канцэртны стыль будзе прадстаўлен скрыпічнымі канцэртамі Хачатур'яна і Столава і фортэп'янным канцэртам Клумава.

Канцэрт Хачатур'яна, які выконваўся 16 лістапада на першым канцэрце IV дэкады совецкай музыкі ў Маскве, быў праслухан аудыторыяй з вялікай увагай. Ён захапляе сваёй глыбокай эмацыянальнасцю, рытмічнай актыўнасцю і бурным, яркім апяваннем радасці жыцця. У асобе таленавітага скрыпача праф. Д. Ойстраха кампазітар знайшоў выдатнага інтэрпрэтатара свайго твора.

Скрыпічны канцэрт Столава сведчыць аб высокім майстэрстве кампазітара. У Столава прыроднае чуццё інструментальнага каларыту і вялікія веды ў скрыпічнай тэхнікі (Столаў сам добра іграе на скрыпцы). Калі ў першых творах, напісаных у Мінску (тав. Столаў прыехаў к нам з Вільнюса), адчувалася некаторае захапленне знешне-фармальнымі момантамі за кошт зместу, то ўжо ў сімфанічнай паэме і скрыпічным канцэрце Столаў пераадольвае ўплывы заходняга джаза і моцна становіцца на шлях асваення прынцыпаў совецкага мастацтва.

Пачнецца IV дэкада совецкай музыкі ў Мінску вялікім канцэртам пры ўдзеле сімфанічнага аркестра, харавой капэлы і салістаў.

На абмеркаванне шырокай аудыторыі будуць вынесены кантата аб Сталіне Залатарова альбо паэма Шчэглова, 6-я сімфонія Шастаковіча і скрыпічны канцэрт Хачатур'яна ў выкананні праф. Д. Ойстраха.

У праграму другога і трэцяга канцэртаў паміма сімфанічнай музыкі ўключаны народныя песні ў выкананні Ірмы Яунзем. Ірма Яунзем правяла вялікую работу к паказу эстраднага мастацтва і, відавочна, выступіць у Мінску з карэла-фінскімі, малдаўскімі, эстонскімі, латвійскімі і літоўскімі народнымі песнямі. Гэта будзе выдатная дэманстрацыя народных песень новых совецкіх рэспублік.

Чацверты канцэрт уключае сімфанічную паэму, скрыпічны канцэрт Столава (выконвае засл. артыст Амітон) і дзве сюіты з балетаў «Шчасце» — Хачатур'яна і «Залатое калоссе »— Кабалеўскага.

Пяты канцэрт — цалкам камерны. У ім прымаюць удзел госці з Украіны: лаўрэат Усесаюзнага конкурса вакалістаў Рудзенка (меццасапрана) і заслужаны дзеяч мастацтваў УССР Часцій, салісты опернага тэатра заслужаныя артысты БССР Аляксеева і Дзяніcаў і віяланчэліст Власаў.

Заключны канцэрт дэкады цалкам прысвечан украінскай музыцы. Выконваюцца сімфанічныя творы Гозенпуда і Майбарады і сюіта з украінскіх народных песень кампазітара Таранава ў выкананні салістаў аркестра. Апрача беларускіх дырыжораў Мусіна і Сімеонава, запрошаны дырыжоры Стасевіч (Масква) і Канерштэйн (Кіеў).

У заключэнне, гаворачы аб праграмах канцэртаў дэкады, хочацца папракнуць Філармонію за адсутнасць у іх імён буйных беларускіх кампазітараў — Туранкова, Аладава, Багатырова, Цікоцкага, Крошнера і інш. Гэты папрок зусім справядлівы, калі ўлічыць, што Філармонія нічога не зрабіла для прыцягнення названых кампазітараў к актыўнай падрыхтоўцы да IV дэкады совецкай музыкі.

Рэпетыцыі канцэртаў дэкады пачаты. Артысты Філармоніі і эстрады з велізарным уздымам рыхтуюцца к гэтай творчай справаздачы — святу музычнага мастацтва. Пажадаем ім поспеху ў цікавым і адказным паказе новых музычных твораў шырокаму совецкаму слухачу.

1-шы Усебеларускі вакальны конкурс

★
Дырыжор А. Ратнер
★

I.

Мастацтва Совецкай Беларусі за апошнія годы свайго развіцця гіганцка шагнула наперад.

У нашай рэспубліцы выраслі ўласныя кампазітары, творцы беларускай музыкі з ярка абрысаванымі творчымі індывідуальнасцямі, кампазітары, творчасць якіх мае значэнне не толькі для Беларусі, але і для развіцця музычнай культуры ўсёй краіны. Выраслі кадры выканаўцаў музыкі, якіх да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі не было.

Оперны тэатр, які вырас з маленькай студыі, ператварыўся ў мастацкую адзінку вялікага маштабу, лічыцца пятым па свайму значэнню ў Совецкім Саюзе і разам з тым з'яўляецца школай для выхавання спевакоў, як маладых, так і больш вопытных. Беларуская кансерваторыя за апошнія годы сваёй дзейнасці дабілася вялікіх творчых поспехаў. Лепшыя спевакі нашай рэспублікі з'яўляюцца выхаванцамі і вучнямі гэтай музычнай установы.

II.

Вопыт І-га Усесаюзнага вакальнага конкурса павінен у многім дапамагчы нам пры правядзенні рэспубліканскага конкурса вакалістаў. І-шы Усесаюзны конкурс вакалістаў, праведзены ў Маскве, адыграў вялікую ролю, меў вялікае выхаваўчае значэнне. Усесаюзны конкурс паказаў, што краіна мае шмат таленавітых выканаўцаў з цудоўнымі галасамі. Праграма вакальнага конкурса была вельмі складанай і цяжкой. У першым туры спявак павінен быў паказаць сябе ў 6—7 розных стылях і толькі пасля таго, як ён паказаў сваё валоданне творамі такіх разнастайных майстроў, як Бах, Гендэль, Бетховен, Персель, Філідор, калі ён паказаў валоданне рускай класікай, італьянскай, французскай і нарэшце, стылем совецкай музыкі, толькі пасля гэтага можна было меркаваць аб музычнай і вакальнай спеласці таго ці іншага вакаліста. Усесаюзны конкурс патрабаваў ад першага туру не толькі валодання голасам, разнастайнасці рэпертуару, школы, але і галоўным чынам, — творчай спеласці. Апрача таго, Усесаюзны конкурс ставіў сабе мэтай прадэманстрыраваць існуючыя ў СССР вакальныя школы і напрамкі. За гэтым спаборніцтвам спевакоў сачыла ўся грамадскасць нашай краіны.

Побач з вялікімі і цікавымі з'явамі ў галіне вакалу, побач з паказам раду бліскучых дараванняў і выдатных галасоў, Усесаюзны конкурс адзначыў і вялікія недахопы. Гэтыя недахопы датычаць вакальнай метадалогіі і выкладання. Адзінага метаду выкладання, як і адзінай школы, не існуе. Нажаль, кожны прафесар, педагог выкладае і навучае толькі тым метадам, які ўласцівы яму аднаму, прычым паміж прафесарамі ў гэтай галіне часта бываюць вялікія рознагалосці. Колькі існуе спевакоў, столькі і розных школ. У галіне фортэп'яннага выканальніцтва, скрыпічнага, інструментальнага гэта пытанне абстаіць больш добра. Усесаюзная вакальная канферэнцыя, працы якой яшчэ не апублікаваны, ёсць толькі ў стэнаграмах, прысвяціла сваю работу аднаму з важнейшых пытанняў вакалу — пытанню методыкі, школы, выкладання спеваў. Рашэнні вакальнай канферэнцыі аб спеваках, аб захаванні голасу, аб паступовым развіцці галасавых даных, аб ахове галасоў у дзіцячы перыяд выхавання спевака прынясуць шмат карысці.

Беларускі вакальны конкурс, які ўпершыню наладжваецца ў нашай рэспубліцы, і ўпершыню ў нацыянальнай рэспубліцы пасля Усесаюзнага конкурса, павінен пераняць вопыт Усесаюзнага конкурса і ўсё лепшае скарыстаць прыстасоўна да ўмоў нашага конкурса.

Для братняй дапамогі неабходна запрасіць народную артыстку СССР тав. Барсаву, Даліво-Сабатніцкага, прафесара Райскага і інш. Прысутнасць гэтых аўтарытэтных майстраў узніме значэнне конкурса.

III

Якія задачы стаяць перад 1-м Усебеларускім вакальным конкурсам?

Конкурс павінен з'явіцца дэманстрацыяй нашых творчых дасягненняў на новым этапе развіцця беларускага мастацтва, г. зн. пасля дэкады. Пасьлядэкадны перыяд характэрны вялікім творчым ростам беларускай музычнай культуры. Кампазітары стварылі рад глыбокіх і значных твораў. Кампазітар Цікоцкі напісаў сімфанічную паэму для хора з аркестрам на сюжэт аб вызваленні Заходняй Беларусі з-пад панскага ярма. Кампазітар Шчэглоў закончыў рад твораў, сярод якіх ёсць беларускія арыгінальныя песні, араторыя для хора, прынятая для выканання ў Дзяржаўным хоры Саюза ССР у Маскве і ў Ленінградскай капэле. Кампазітар Столаў закончыў канцэрт для скрыпкі, кампазітар Аладаў—два вялікіх сімфанічных творы. Кампазітар Палонскі працуе над песнямі і музыкай да кінофільмаў, малады кампазітар Падкавыраў заканчвае оперу «Як гартавалася сталь».

Беларускі вакальны конкурс павінен паказаць усе гэтыя дасягненні і ўсё тое, што праробленa за гэты час, а для гэтага неабходна, каб у конкурсе прымалі ўдзел усе лепшыя сілы рэспублікі. Павінны прыняць удзел у ім не толькі маладыя, пачынаючыя спевакі (іх удзел абавязковы), але і нашы маcцітыя—народныя, заслужаныя артысты, бо на іх вопыце здолее вучыцца моладзь. Без творчага абмену вопытам, без пастаяннага паглыбленага слухання іншых спевакоў і аналітычнага ўспрыняцця іх не можа вырасці спявак.

У конкурсе павінны прыняць удзел і лепшыя прадстаўнікі самадзейнасці.

IV.

Праробленa ўжо вялікая арганізацыйная работа к конкурсу, адбыліся нарады, на якіх вынесены практычныя рашэнні для паляпшэння ходу падрыхтоўкі. Чотка распрацавана праграма і патрабаванні да ўдзельнікаў конкурса. у Беластоцкай, Баранавіцкай і Мінскай абласцях адабраны ўдзельнікі конкурса. Усё-ж неабходна адзначыць некаторую вяласць і непаваротлівасць асобных арганізацый. Напрыклад, Тэатр оперы і балета, дзе згуртаваны лепшыя спевакі не толькі Мінска, але і Беларусі, слаба разгортвае работу, а тэатр можа даць на конкурс шмат цікавага, карыснага і павучальнага. У тэатры шмат маладых спевакоў нядаўна скончыўшых кансерваторыю. Яны могуць быць сур'ёзнымі прэтэндэнтамі на заняцце пачэсных месц у конкурсе, іх неабходна арганізаваць і прыцягнуць к конкурсу. Ды і тэатр павінен быць у гэтым зацікаўлен, бо, паказваючы сваіх спевакоў, ён разам з тым паказвае сваю штодзённую творчую работу.

Пры журы конкурса павінна працаваць метадалагічная камісія, якая павінна падагуліць вынікі конкурса па ўсіх раздзелах: методыкі выканальніцтва, музычнай культуры, педагагічнага вопыту і вакальнай школы. Пры гэтых умовах конкурс адыграе сваю выхаваўчую ролю ў развіцці вакальнага мастацтва нашай рэспублікі.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У4470 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Мінск, друкарня «Звязда».